

ЦУКАР — ЗАБОЙЦА? 
7

У КІТАІ ПАЧАЎСЯ ГОД ДРАКОНА 
8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

10 ЛЮТАГА 2024 г. СУБОТА № 29 (30163)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр КУЛІК, міністр лясной гаспадаркі:**

*«У 2023 годзе ў гадавальніках вырашчана больш за 400 млн штук стандартнага пасадачнага матэрыялу, а таксама звыш 200 відаў і форм драўняных раслін. Па падліках, у гэтым годзе нам спатрэбіцца больш за 170 млн раслін для правядзення лесакультурных работ. Гэта звычайная хвоя, еўрапейская елка, павіслая бяроза, чаранкаваты дуб. Лясгасы Беларусі ў цэлым забяспечаны пасадачным матэрыялам».*

# Калі ажываюць... маркі





У руках Кацярыны ЛЯШКОВАЙ, інжынера цэнтра арганізацыі аказання паслуг вытворчасці «Мінская пошта» РУП «Белпошта», — філатэлістычны набор «AR MARKA BELARUS». Тут справа не толькі ў адмысловых марках, а ў мабільным дадатку з такой назвай. Пры навядзенні на паштовыя блокі і маркі камеры гаджэта з запушчаным дадаткам AR MARKA BELARUS малюнак на марцы ажывае, з'яўляецца спецыяльна створаны сцэнарый у дапоўненай рэальнасці. Дадатак AR MARKA BELARUS прымяняецца да паштовых марак «Старажытныя паштовыя маршруты», «Залатая птушка» і «Купалле», да паштовых блокаў, прысвечаных 75-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 1000-годдзю з часу першай пісьмовай згадкі Брэста, а таксама да паштовага блока «Каложская ікона Божай Маці». Філатэлісты будуць задаволеныя.

**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## КОРАТКА

- **Аб'яўлены прыём заявак на ўдзел у Міжнароднай бізнес-прэміі «Лідар года 2024».**
- У 2023 годзе Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў папоўніўся 24 аб'ектамі.
- **МЭТЗ імя В. І. Казлова асвоіў серыйны выпуск трансфарматараў для аэрадромнага абсталявання.**
- «Бархім» запусціў абноўлены цэх па выпуску вадкіх мыйных сродкаў.
- **У 2024 годзе запланавана рэстаўрацыя Акадэміі музыкі і тэатра імя М. Горкага. Зацверджаны парадак бясплатнага забеспячэння прэпаратамі, якія не ўваходзяць у Рэспубліканскі фармуляр лексродкаў.**



- «Белтэлекам» папярэджвае аб работах на сетцы эфірнага ТБ і радыё 12—16 і 19—23 лютага.

ISSN 1990 — 763X

Соцыум

# ПРАГУЛКА Ў БУРШТЫНАВЫМ ПАКОІ І СОН НА ВУЛЛЯХ

### Якія медыцынскія кірункі карыстаюцца попытам у замежнікаў, і чаго яны чакаюць ад нашых санаторыяў?

**Замежнікі, якія прыязджаюць у нашу краіну паправіць здароўе, у асноўным робяць гэта па такіх кірунках, як кардыялогія, анкалогія, афтальмалогія, хірургія і нейрахірургія. Традыцыйна карыстаюцца попытам стаматалагічныя паслугі. А вось найбольш сродкаў медыцынскі турызм прыносіць па такіх галінах, як транспланталогія і гематалогія, а таксама пластычная хірургія.**

Беларускія санаторыі карыстаюцца попытам у нашых суседзяў даўно. Праўда, сёння мяняецца аўдыторыя здраўніц і, адпаведна, патрабаванні да іх. Таму ў многіх санаторыях сёння ўмовы імкнуцца прывесці да сусветных стандартаў гасціннасці. Ужо недастаткова дыетычнага харчавання, наведвальнікі жадаюць шведскі стол, і адныімі медыцынскімі працэдурамі не абмежавацца: санаторыі будуюць асобныя СПА- і велнес-цэнтры. Што жадаюць бачыць медыцынскія турысты, і наколькі гэта супадае з магчымасцямі айчыннай медыцыны і санаторна-аздараўленчых устаноў, расказалі спецыялісты. СТАР. 4

Міласэрнасць

# ПРЫТУЛАК ДЛЯ ТЫХ, ХТО АПЫНУЎСЯ Ў БЯДЗЕ

**Сужэнцы з Індыі Сінгх Мастан і Каур Гурджэй трапілі ў Магілёў не падчас падарожжа. Іх разам з маленькай дачкой Керам прывяло сюды цяжкае жыццёвае становішча. Пакуль вырашаецца пытанне з аднаўленнем іх дакументаў, яны жывуць у сценах крызіснага цэнтра Магілёўскага аддзялення Чырвонага Крыжа. І ўдзячныя добрым людзям, што не кінулі іх у бядзе.** СТАР. 5



Фота Наталлі КАПРЫЛЕНКІ.

Лічбавізацыя

# «МАБІЛЬНЫ ПАШТАЛЬЁН» У «РАЗУМНЫМ ГОРАДЗЕ»

## Перспектывы развіцця сферы ІКТ у Беларусі

**Галіна сувязі і інфарматызацыі ў нашы дні — пастаўшчык самых, мабыць, запатрабаваных паслуг: без іх немагчыма ўявіць сучасны свет. Не будзе перабольшаннем сцвярджэнне, што тым ці іншым наборам паслуг, якія аказваюць прадпрыемствы сувязі краіны, карыстаецца кожны жыхар Беларусі.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Гэта падкрэсліў у ходзе медыябрыфінгу, прысвечанага вынікам работы галіны ў 2023 годзе і перспектывам развіцця сферы ІКТ нашай краіны, **міністр сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь Канстанцін ШУЛЬГАН.**

— Міністэрствам фактычна завершана фарміраванне стымуляцыйнага заканадаўства па лічбавым развіцці, — адзначыў ён. — Гэта ўказы кіраўніка дзяржавы № 136 («Аб органе дзяржаўнага кіравання ў сферы лічбавага развіцця і пытаннях інфарматызацыі») і № 381, а таксама шэраг іншых пастаноў, якія сістэматызавалі падыходы па экспертызе, паказчыках ацэнкі, закупках, іншых пытаннях, што рэгулююць работу на ўнутраным лічбавым рынку дзяржавы. Нарматыўная база дае магчымасць укаранення лічбавых праектаў на ўсіх галінах.

Інструмент яе практычнай рэалізацыі — Прагрillустрама лічбавага развіцця на 2021—2025 гады.

— З 86 праектаў, якія ўключае дзяржпраграма, 20 ужо завершаны і астатнія за 2024—2025 гады будуць рэалізаваны, — распавёў Канстанцін Шульган. — У 2023 годзе Міністэрствам выбудавана сістэма праграцоўкі такіх праектаў праз калегіяльны орган — Савет па праектах у сферы лічбавага развіцця.

За мінулы год адбыліся пасяджэнні савета больш як па 70 пытаннях, якія датычыліся разгляду ініцыятыў, стратэгічных праектаў па лічбавым развіцці, уключаючы пытанні лічбавага суверэнітэту, расказаў кіраўнік галіны. Саветам разгледжана каля 60 лічбавых ініцыятыў, і больш за палову з іх падтрыманы, пачата іх рэалізацыя. У краіне створана і актыўна працуе сістэма з Цэнтра лічбавага развіцця і офісаў лічбавізацыі (гэта падраздзяленні, якія знаходзяцца непасрэдна ў галінах).

### У ідэях недахопу няма

Рэгіёны сёння — найбольш актыўныя ўдзельнікі пасяджэнняў савета, яны даюць усё новыя і новыя ідэі, забяспечваючы наш IT-рынак тымі праектамі, якія неабходны для вырашэння задач па лічбавай трансфармацыі эканомікі ў маштабах усёй краіны, падкрэсліў міністр. Праекты гэтыя цікавыя і сацыяльна значныя, дадаў ён.

Напрыклад, праект «Культурны Мінск» прадугледжвае стварэнне сэрвісаў для алічбоўкі культурнага жыцця сталіцы. І Мінскам справа не абмяжуецца — праект ахопіць і іншыя гарады. Гэтак жа, як, напрыклад, пачаты тры гады таму праект «Мой горад»: першым быў Полацк, а сёння рэсурсам карыстаецца насельніцтва 45 гарадоў Беларусі, уключаючы два абласныя цэнтры, Магілёў і Віцебск, яшчэ 18 гарадоў рыхтуюцца да запуску. Мабільны рэсурс стаў інструментам узаемадзеяння жыхароў з гарадскімі службамі і сэрвісамі.

Сярод найбліжэйшых перспектыў лічбавага развіцця краіны — улік пасажырапатоку і развіццё сэрвісаў аплаты працы, пабудова маршрутаў і развіццё медыцынскай сістэмы, алічбоўка вытворчых працэсаў і забеспячэнне аграрыяў тэхналогіямі дакладнага земляробства.

— Адзін з найважнейшых кірункаў — перавод у электронную форму адміністрацыйных працэдур. Гэта дазволіць затрачваць на іх мінімальны час, — распавёў міністр сувязі. — Як прыклад, рэгістрацыя па месцы жыхарства грамадзян Рэспублікі Беларусь і замежных грамадзян, замена страчанага вадзіцельскага пасведчання, улік грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама выдзяленне арэнднага жылля.

### Усё анлайн

Сярод найбольш значных дасягненняў галіны ў 2023 годзе міністр назваў укараненне Дзяржаўнай адзінай рэспубліканскай сістэмы ўліку і апрацоўкі зваротаў грамадзян і юрыдычных асоб, што дае магчымасць ажыццяўляць цэнтралізаваны ўлік, захоўванне электронных і пісьмовых зваротаў і адказаў на іх, а таксама кантроль за іх разглядам. Для карыстальніка гэты сэрвіс просты і інтуітыўна зразумелы, але яго распрацоўка патрабавала мноства высокапрафесійных рашэнняў.

— Прастата сэрвісу толькі знешняя. Карыстальнікамі сістэмы з'яўляюцца ўсе (акруглім лічбу) 10 мільёнаў нашых грамадзян. Уявіце інфармацыйную сістэму, у якой такая колькасць карыстальнікаў! Гэта складаная сістэма, і яна ўжо працуе. І мы дапрацоўваем яе, улічваючы пажаданні людзей, — падкрэсліў Канстанцін Шульган.

Праект беларускіх айцішнікаў на найбліжэйшую будучыню — «Разумныя гарады Беларусі». Ужо папулярны сэрвіс «Мой горад» стане адным з яго складнікаў.

— Работа ідзе, ствараецца ядро праекта. Гэта тыпавая рэгіянальная лічбавая платформа, якая будзе маштабавацца па ўсёй краіне, — сказаў міністр. — Сістэма прызначана для таго, каб усе адміністрацыйныя пытанні і ў цэлым усе пытанні функцыянавання ў дзяржаве вырашаліся праз яе.

Платформа «Разумны горад» будзе ўкаранёна спачатку ў 17 гарадах, а пасля — у маштабах усёй краіны.

### Паведаміце «Хвалі»

Лічбавая сфера, як ніякая іншая, патрабуе працаваць у сувязі з усім светам. Наша краіна — частка сусветнай лічбавай сістэмы. Таму настолькі важны ўдзел беларускіх спецыялістаў у мерапрыемствах, якія праводзяцца ў рамках Міжнароднага саюза электрасувязі, дзе вызначаюцца асноўныя моманты развіцця сотавай сувязі і любых інфармацыйных узаемадзеянняў, падкрэслівалі спікеры падчас брыфінгу. У канцы мінулага года беларуская дэлегацыя прыняла ўдзел у Сусветнай канферэнцыі па радыёсувязі ў Дубаі, і інтарэсы нашай краіны былі ўлічаны яе рашэннямі, расказалі на брыфінгу.

Беларусь заслужана знаходзіцца ў ліку краін з развітой лічбавай інфраструктурай. Сёння «Белтэлекамам» эксплуатуецца каля 200 000 км сучасных валаконна-аптычных ліній сувязі (іх працягласці хапіла б, каб 5 разоў абагнуць па экватары зямны шар). Абанентаў шырокапалоснага доступу ў сетку Інтэрнэт у краіне — 12,66 млн. Абаненцкая база сотавай сувязі ў краіне складае 11,75 млн. Заўважым, што абедзве лічбы большыя за колькасць жыхароў нашай краіны.

Што да сотавай сувязі, перад галіной стаяць задачы па развіцці тэхналогій і паляпшэнні якасці яе паслуг.

— Сістэма кантролю якасці паслуг рэалізавана на інфармацыйнай платформе хваля.бел, — распавёў Канстанцін Шульган. — Такой сістэмы няма ні ў адной краіне СНД.

З дапамогай мабільнага дадатку «Хваля» абанент можа самастойна ацаніць якасць паслуг свайго сотавага аператара ў пункце прыёму сігналу. Кожны жыхар краіны атрымаў магчымасць паказаць, дзе ёсць праблемы з сотавай сувяззю і мабільным інтэрнэтам, каб аператары маглі комплексна вырашаць гэтыя пытанні.

Ну а праект «Мабільны пашталён» разлічаны ў першую чаргу на больш узроставую катэгорыю карыстальнікаў, каб можна было дайсці да кожнага кліента і чалавек мог дома атрымаць такія ж паслугі, як у паштовым аддзяленні.

### 5G — ужо хутка

Спецыялісты сферы інфарматызацыі актыўна ўключыліся ў працэс лічбавай трансфармацыі прадпрыемстваў краіны. Ужо ёсць прыклады, якія пацвярджаюць: тыя працэсы, якія раней выконваліся «па-старому», перайшоўшы ў лічбавы фармат, сталі залогам станоўчых вынікаў як у аптымізацыі выдаткаў, так і ў пытаннях якасці. Першая на чарзе прамысловасць: плануецца пераход прадпрыемстваў краіны на перадавую тэхналогію «Індустрыя 4.0». У найбліжэйшых планах таксама — прадпрыемствы аграрнага сектара і лічбавае земляробства.

Яшчэ адзін перспектыўны кірунак — пераход да тэхналогіі 5G. Паслугамі 4G сёння ахоплена 98,4 працэнта насельніцтва нашай краіны. Падрыхтоўчыя работы па пераходзе на 5G ужо завершаны. У найбліжэйшы час усе мы станем відавочцамі таго, як будзе ўкараняцца ў жыццё краіны гэтая тэхналогія.

Не спыняецца і работа па пераводзе ў электронны фармат адміністрацыйных працэдур. Працэс спланаваны, мерапрыемствы ўключаны ў дзяржпраграму, і неўзабаве больш за 400 адміністрацыйных працэдур будуць алічбаваны.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

АДЗІНЫ ДЗЕНЬ ГАЛАСАВАННЯ

# ХОЧАШ ПРАГАЛАСАВАЦЬ — УДАКЛАДНІ

**Пачынаючы з 9 лютага выбаршчыкі маюць права звярнуцца ва ўчастковую выбарчую камісію па месцы сваёй рэгістрацыі і ўдакладніць, ці ўключаны яны ў спіс выбаршчыкаў, а таксама праверыць правільнасць указаных аб іх звестак.**

Калі грамадзянін мае жаданне прагаласаваць не па месцы рэгістрацыі, а па месцы пражывання, то ў яго ёсць права звярнуцца ва ўчастковую выбарчую камісію па месцы пражывання ў перыяд з 9 да 24 лютага 2024 года. Чалавек можа быць уключаны ў спіс выбаршчыкаў па месцы пражывання на падставе пашпарта (ідэнтыфікацыйнай карты) грамадзяніна Рэспублікі Беларусь і пры наяўнасці дакумента, які пацвярджае пражыванне на тэрыторыі ўчастка для галасавання (напрыклад, дагавора куплі-продажу, дагавора найму, зарэгістраванага ў выканкаме, або іншага дакумента, які пацвярджае пражыванне).

У адзіны дзень галасавання — 25 лютага 2024 года — уключэнне ў спіс выбаршчыкаў, якія не зарэгістраваны на тэрыторыі ўчастка для галасавання, не прадугледжана законам.

З 9 да 19 лютага 2024 г. участковыя выбарчыя камісіі працуюць з панядзелка да пятніцы з 17.00 да 19.00, у суботу — з 12.00 да 14.00.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Спікер палаты прадстаўнікоў ЗША заявіў, што Байдэну нельга займаць сваю пасаду

Спікер палаты прадстаўнікоў ЗША Майк Джонсан заявіў, што амерыканскі лідар Джо Байдэн не падыходзіць для работы на прэзідэнцкай пасадзе. «Вячэрняя прэс-канферэнцыя прэзідэнта дадаткова пацвердзіла ў прамым эфіры падкрэсленае спецпракурорам: ён не падыходзіць для работы на пасадзе», — напісаў Джонсан у сацсетцы, паведаміла РІА «Новости». Спікер палаты прадстаўнікоў — трэцяя пасада ў іерархіі ўлады ЗША пасля прэзідэнта і віцэ-прэзідэнта. Байдэн раней падчас спецыяльнага выступлення ў Белым доме выказаў абурэнне з-за часткі справаздачы спецпракурора аб неналежным захоўванні амерыканскім лідарам дакументаў, у якой прэзідэнт названы «пажылым мужчынам з праблемамі з памяццю». Кіраўнік ЗША запэўніў, што з яго памяццю «усё добра». Зрэшты, у канцы выступлення ён зноў абмовіўся, пераблытаўшы Егіпет з Мексікай. У апошнія дні праблемы з памяццю дзейнага прэзідэнта ЗША выяўляюцца асабліва востра: тройчы ён расказваў гісторыі, у якіх замест дзейных кіраўнікоў дзяржаў памылкова згадваў іх ужо памерлых папярэднікаў.

### Вулканічная лава ў Ісландыі паглынула водаправод

Вывяржэнне вулкана на паўднёвым захадзе Ісландыі, трэцяе са снежня, ужо прывяло да знікнення дарогі, а некалькі населеных пунктаў на паўвостраве Рэйк'янес засталіся без гарачай вады і ацяплення пасля таго, як паток лавы паглынуў водаправод. «Сітуацыя развіваецца хутчэй, чым чакалася», — прызнала прэм'ер-міністр краіны Катрын Якабсдаўтыр, запэўніўшы, што прымаюцца рашэнні па кіраванні з'явай, якая, кажуць спецыялісты, некалькі непрадказальная, перадае Euronews.



«Тут было некалькі вывяржэнняў у моры недалёка ад паўвострава, але на сушы нічога не адбывалася на працягу амаль 800 гадоў, — адзначыў вулканолаг Дэйв МакГарві. — А за гэты час на астатняй тэрыторыі Ісландыі адбылося, мусіць, 150—200 вывяржэнняў. Таму, натуральна, людзі вырашылі, што гэты раён бяспечны і пачалі будаваць». Месца вывяржэння знаходзіцца прыкладна за чатыры кіламетры ад Грындавіка, прыбярэжнага горада, эвакуіраванага 18 снежня з-за вулканічнай актыўнасці.

### У Швейцарыі мужчына з сякерай і нажом у цягніку ўзяў у заложнікі 15 чалавек

Пра гэта паведаміла тэлекампанія RTS, піша газета «Известия». «Нападнік прымусіў машыніста пакінуць сваё месца і далучыцца да 14 пасажыраў, якія знаходзіліся ў цягніку, спыненым з зачыненымі дзвярыма на станцыі Эсер-су-Шамван, паміж камунамі Больм і Івердан-ле-Бэн», — сказана ў публікацыі. У паліцыю змог датэлефанавацца адзін з заложнікаў. Праваахоўнікі, якія прыбылі на месца здарэння, паспрабавалі ўстанавіць кантакт са злачынцам пры дапамозе перагаворшчыкаў. Для гэтага выкарыстоўваліся мабільныя тэлефоны зачыненых у цягніку людзей. Заложнікі былі вызвалены, ім і іх сем'ям аказана неабходная дапамога брыгадамі экстраннай дапамогі і псіхалагічнай службай. Падчас аперацыі па вызваленні заложнікаў злачынец быў забіты.

Актуальна

# ДА ВЯЛІКАЙ ВАДЫ РЫХТУЮЦЦА ПА МАКСІМУМЕ

**Гатоўнасць органаў кіравання, сіл і сродкаў да рэагавання на паводкавую сітуацыю абмеркавалі на аператыўнай нарадзе ў Гомелі. Нараду на базе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС правёў старшыня гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.**

У рабоце прынялі ўдзел прадстаўнікі камісій па надзвычайных сітуацыях вобласці, кіраўніцтва абласнога ўпраўлення МНС, Таварыства выратавання на водах, кіраўнікі мясцовых органаў улады і суб'ектаў гаспадарання. Па анлайн-сувязі да аператыўнай нарады далучыліся і прадстаўнікі раёнаў вобласці.

Як адзначыў **начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ДЗІЧКОЎСКІ,** паводкавая абстаноўка на тэрыторыі рэгіёна абвастрылася з другой паловы снежня мінулага года. Тады зафіксавалі першыя падтапленні талымі водамі жылой забудовы ў населеных пунктах. З канца мінулага года ў вобласці зарэгістравалі 85 фактаў падтапленняў жылых дамоў, 24 — падвальных памяшканняў, 189 — падворкаў і 76 — гаспадарчых пабудоў. Сёння ў 13 раёнах вобласці і Гомелі застаюцца падтопленымі 75 жылых дамоў, 18 падвальных памяшканняў, 140 падворкаў, 61 гаспадарчая пабудова. Найбольшая колькасць фактаў падтаплення зафіксавана ў Гомельскім раёне. Напружаная сітуацыя — у Веткаўскім і Добрушскім.



Удзельнікі аператыўнай нарады прааналізавалі прагнозы павышэння ўзроўню грунтовых і рачных вод на тэрыторыі абласнога цэнтра і раёнаў вобласці. Асаблівая ўвага — гатоўнасці аказаць дапамогу людзям, якія апынуліся ў зоне падтапленняў.

— Сёння ніякай надзвычайнай сітуацыі няма, але моцныя ападкі ў выглядзе снегу і дажджу пастаянна дадаюць вады ў рэках па ўсёй вобласці, — звярнуў увагу старшыня аблвыканкама Іван Крупко. — Рэкі ў вобласці знаходзяцца ў межах сваёй поймы. Наша задача — спрагназаваць далейшую сітуацыю і захоўваць гатоўнасць службаў да работы ў выпадку надзвычайнай сітуацыі. Аператыўная абстаноўка на тэрыторыі Гомельскай вобласці патрабуе ад кіраўніцтва ўсіх узроўняў асаблівай увагі, хуткага рэагавання на падтапленне тэрыторыі населеных пунктаў, забеспячэння нармальных умоў жыццядзейнасці насельніцтва.

Кіраўнік рэгіёна падкрэсліў, што на Гомельшчыне адзначана найбольшая колькасць фактаў падтаплення жылых дамоў, прысядзібных участкаў, аўтамабільных дарог у параўнанні з іншымі рэгіёнамі краіны. Губернатар папрасіў даць ацэнку выканання даручэнняў, дадзеных па выніках паводкі 2023 года, у тым ліку забеспячэння інжынерных збудаванняў для абароны тэрыторый ад падтапленняў.

Як растлумачыў **начальнік галоўнага ўпраўлення ЖКГ Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый ЗГУРСКІ,** запланавана будаўніцтва адкрытых і закрытых каналаў для адводу талых вод і частковага паніжэння ўзроўню грунтовых вод у аграгарадку Краснае Гомельскага раёна.

— Праектна-каштарысная дакументацыя распрацавана, чакаем фінансавання і прыступім да работ. Вядома, не атрымаецца цалкам выключыць падтаплення, але гэта дазволіць палепшыць сітуацыю з адводам талых вод ад населенага пункта. Другі праект, які мы пачнём рэалізоўваць сёлета — яго дакументацыя праходзіць дзяржэкспертызу, — гэта пачатак будаўніцтва дамбы для абароны ад падтапленняў пасёлкаў Сеўрукі, Чонкі і Паляна ў Гомельскім раёне. Будаўніцтва гэтага вялікага аб'екта разлічана на некалькі гадоў. Ён дазволіць абараніць у тым ліку шматпавярховыя дамы, прыватны сектар у зоне магчымага падтаплення, — удакладніў Дзмітрый Згурскі.

Некалькі праектаў узвядзення супрацьпаводкавых інжынерных збудаванняў запланаваны там, дзе «вялікая вада» пагражае найбольшай колькасці мясцовага насельніцтва. Гэта Манастырок, Якубоўка, Плёсы, Уза, Старая Валатава, што на тэрыторыі Гомеля і Гомельскага раёна. Пакуль для гэтых маштабных аб'ектаў распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя.

**Старшыня Гомельскага гарвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ** праінфармаваў аб паводкавай сітуацыі на тэрыторыі абласнога цэнтра. Ён адзначыў, што паводкавая абстаноўка ў горадзе кантралюецца, вядзецца пастаянны маніторынг магчымых месцаў падтаплення.

— Пакуль узровень вады ракі на тэрыторыі Гомеля 392 сантыметры, а крытычны — 500. Мы правялі штаб з выездам у месцы, якія падтапляліся летась. Гэта Манастырок і Старая Валатава. Цяпер у Старой Валатаве праблем увогуле няма. У Манастырку пачалі падвозіць грунт для падсыпкі на ўчастак, якому можа пагражаць падтапленне. Створаны прамыя тэлефонныя лініі з МНС. Кіраўнікі адміністрацый правялі сустрэчу з насельніцтвам і паведамілі, куды звяртацца пры ўзнікненні надзвычайных сітуацый. Таксама на выпадак рэзкага ўздыму ўзроўню вады падрыхтавалі каля 70 месцаў у інтэрнатах для размяшчэння людзей з адзначаных вуліц, — падкрэсліў Уладзімір Прывалаў.

Для рэагавання на паводкавую абстаноўку на базе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС створаны мабільны атрад. Яго галоўная задача — аказанне дапамогі насельніцтву. Падобныя мабільныя атрады сфарміраваны ў Мазырскім і Жлобінскім раёнах. Акрамя таго, запланавана адкрыць каля 13 мабільных пастоў МНС на тэрыторыі Гомеля і раёнаў вобласці для транспарціроўкі людзей з затопленых участкаў і аказання ім дапамогі.

Па выніках аператыўнай нарады старшыня аблвыканкама Іван Крупко заклікаў органы кіравання на месцах, усе адказныя службы і ведамствы быць гатовымі да ўсіх магчымых варыянтаў развіцця паводкавай сітуацыі ў рэгіёне.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА,**
**фота Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС.**

Тры пытанні да ўлады

# УПОР НА МАДЭРНІЗАЦЫЮ

**Пра набыткі і перспектывы сельскагаспадарчай галіны, мадэрнізацыю і абнаўленне аб'ектаў аховы здароўя і адукацыі, будаўніцтва жылля ў горадзе-спадарожніку наша сённяшняя размова са старшынёй Жабінкаўскага райвыканкама Андрэем КУЗЬМІЧОМ.**



***— Ведаю, што на леташніх Дажынках Жабінкаўскі раён не раз адзначалі ў ліку лепшых. Раскажыце, Андрэй Мікалаевіч, пра асноўныя вынікі земляробаў у мінулым сезоне, а таксама пра дасягненні жывёлаводаў і складнікі іх поспехаў.***

— Сапраўды, наш аграпрамысловы комплекс спрацаваў летась вельмі нядрэнна. Прывяду некалькі лічбаў у якасці ілюстрацыі таго, што сказана. Мы занялі другое месца ў вобласці па тэмпах росту валавой вытворчасці збожжавых, з улікам кукурузы атрымалі амаль 72 тысячы тон. Гэта вельмі дастойны вынік для нашага раёна. Рэкордным стаў мінулы год па вытворчасці алею насення рапсу. Мы атрымалі дзевяць тысяч тон і занялі першае месца ў вобласці. Другая пазіцыя — па тэмпах росту валавой вытворчасці цукровых буракоў, іх атрымана 79 тысяч тон. Нашы аграрыі ўвайшлі ў тройку лідараў па тэмпах росту вытворчасці насення шматгадовых траў.

У галіне жывёлагадоўлі вынікі раёна таксама пераўзыходзяць сярэднеабласныя. Ад кожнай каровы летась атрымана 7731 кілаграм малака. Сярэднясутачныя прывагі буйной рагатай жывёлы склалі 726 грамаў. І адзін, і другі паказчыкі займаюць чацвёртае месца ў вобласці, а па сярэднясутачных прывагах свіней (1933 грамы) мы — у лідарах. Не буду больш стамляць лічбамі, адзначу толькі, што пералічанае дасягаецца працай канкрэтных людзей на кожным з жывёлагадоўчых аб'ектаў. Апошнія мадэрнізуем на сістэмнай аснове. З надзвычай узвядзеных: прафілакторый для маладняку ў ААТ «Жабінкаўскі», жывёлагадоўчае памяшканне для ўтрымання дойнага статку ва ўнітарным прадпрыемстве «АграАзяты». Летась пачалося будаўніцтва малочнатаварнага комплексу ў вёсцы Падлессе ААТ «Хмелева», а таксама рэалізацыя інвестыцыйнага праекта ў ААТ «Мацеевічы» па будаўніцтве двух цялятнікаў на ферме Карды. Сёлета работу плануецца завяршыць і здаць названыя аб'екты. На гэты год таксама распрацавана праграма далейшай мадэрнізацыі шэрагу жывёлагадоўчых аб'ектаў. Зараз вядуцца праектныя работы па ўзвядзенні малочнатаварных фермаў у ААТ «Ракітніца» і ААТ «Вазнясенскі». У абодвух выпадках будзе па два будынкі кароўнікаў, даільна-малочныя блокі. У перспектыве разгорнецца будоўля ў ААТ «Рагазнянскае», ААТ «Арэпічы». Па кожнаму сельгаспрадпрыемству ёсць праграма далейшай мадэрнізацыі для таго, каб паляпшаць умовы ўтрымання жывёлы, нарошчваць аб'ёмы вытворчасці і аб'ёмы рэалізацыі.

А яшчэ — плаціць людзям належную заработную плату. Сёння па тэмпах росту заработнай платы ў сельскагаспадарчай галіне мы на першым месцы ў вобласці. І гэта адзін з галоўных паказчыкаў работы эканомікі. Работа аграрнага сектара, прамысловасці, будаўнічых арганізацый дазволілі нарасціць падатковыя паступленні ў бюджэт. Летась іх паступленне на 28 працэнтаў перавысіла план, што дазволіла зрабіць дадатковыя інвестыцыі ў сацыяльную сферу.

***— У краіне традыцыйна надаецца вялікая ўвага стану ўстаноў аховы здароўя і адукацыі ў рэгіёнах. Што робіцца ў гэтым накірунку?***

— На шляху мадэрнізацыі цэнтральнай раённай бальніцы праведзена вялікая работа. Бягучы рамонт будынка галоўнай установы аховы здароўя раёна, скажам, абышоўся прыкладна ў 1 мільён 200 тысяч рублёў. Бліжэй да канца мінулага года пасля рэканструкцыі было адкрыта аддзяленне анестэзіялогіі і рэанімацыі, праект каштаваў бюджэту каля 2,2 мільёна рублёў. Зараз падыходзіць да канца рамонт хірургічнага аддзялення, вядзецца рамонт цэнтральнай раённай паліклінікі. Згодна з даручэннем кіраўніка дзяржавы, у раёне былі адрамантаваны ўсе ФАПы і амбулаторыі, іх у нас адпаведна — дзевяць і пяць. Праведзены бягучы рамонт сельскіх медыцынскіх устаноў, закуплена дадатковае абсталяванне. Для гэтага прыцягвалі спонсарскія сродкі, як правіла, дапамогу аказвалі сельгаспрадпрыемствы. Работа па паляпшэнні аб'ектаў аховы здароўя працягваецца. Сёлета, напрыклад, атрымалі новы аўтамабіль хуткай дапамогі.

Ва ўстановах адукацыі таксама шмат чаго зроблена. Летась правялі капітальны рамонт Ракітніцкай сярэдняй школы коштам у 1,2 мільёна рублёў. З укараненнем пілотнага праекта арганізацыі школьнага харчавання па новай сістэме яе падхапілі ўсе школы. На набыццё абсталявання накіравана 700 тысяч рублёў з раённага, абласнога, рэспубліканскага бюджэтаў.

***— З нядаўняй пары на развіццё Жабінкі зацікаўлена пазіраюць і брастаўчане, сёлета спаўняецца акурат дзесяць гадоў, як горад атрымаў афіцыйны статус спадарожніка Брэста з усімі наступствамі. Што новага ў жыцці спадарожніка?***

— Са снежня 2021 года з абласнога цэнтра да нас ходзіць гарадскі аўтобус № 77. Раней ён ажыццяўляў тры рэйсы ў дзень. Улічыўшы, што маршрут надзвычай запатрабаваны — аўтобусам ездзяць і студэнты на вучобу, і многія людзі на працу — з 19 студзеня дабавілі яшчэ адзін, чацвёрты рэйс. І ён аказаўся дарэчы. Яно і не дзіва, камунікацыі з абласным цэнтрам узрастаюць, бо павялічваецца аб'ём будаўніцтва жылля. Летась мы ўвялі ў строй 18 тысяч квадратных метраў жылля, у тым ліку 13 тысяч — у горадзе-спадарожніку. Здадзены два шматкватэрныя жылыя дамы і 50 індывідуальных жылых дамоў. На гэты год таксама стаіць задача ўводу ў эксплуатацыю двух шматпавярховых жылых дамоў — на сем і дзевяць паверхаў, якія ўзводзяцца ў новым мікраёне. Названыя дамы размешчаны ў новым квартале. Прыкладна палова жылля рэалізуецца жыхарам Брэста, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў. У снежні мінулага года распачалося будаўніцтва гандлёвага цэнтра на 2,5 тысячы квадратных метраў.

У тэму развіцця горада-спадарожніка арганічна ўпісваюцца яшчэ два праекты, намечаныя на гэты год. Першы — рэканструкцыя прывакзальнай плошчы. Жабінка ўяўляе сабой даволі буйны чыгуначны вузел. У ходзе рэканструкцыі будуць раздзелены зоны чыгуначнага і аўтавакзалаў. У райцэнтры будуецца храм у імя Кірылы Тураўскага. Мяркуем, што сёлета ўдасца ўвесці яго ў эксплуатацыю.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ПРАГУЛКА Ў БУРШТЫНАВЫМ ПАКОІ І СОН НА ВУЛЛЯХ

## БРЭНД КРАІНЫ

Айчынныя санаторыі — вядомы і сталы брэнд нашай краіны, адзначыў **дырэктар Нацыянальнага агенцтва па турызме Дзмітрый МАРОЗАЎ.** Іх колькасць і якасць паслуг сталі важнымі фактарамі прыцягнення ў нашу краіну замежных турыстаў. Гэта і адно з любімых месцаў саміх беларусаў для аздараўлення ўнутры краіны.

— Цікава назіраць, як пашыраецца геаграфія тых, хто прыязджае ў беларускія санаторыі. Некалькі тыдняў таму да нас звярнуліся з беларуска-мальдзіўскага культурнага цэнтра, які адной са сваіх мэт ставіць развіццё беларуска-мальдзіўскага медыцынскага і аздараўленчага турызму. Яны дэтальна аналізавалі міжнародны рынак, накіравалі тэставых турыстаў у Беларусь, каб пагалядзець, якія сэрвісы аказваюцца. І прыйшлі да высновы, што наша краіна прадастаўляе аптымальныя па суадносінах цаны і якасці паслугі, і адкрылі на Мальдзівах такі цэнтр, дзе інфармуюць аб тым, якія паслугі прадастаўляюцца, і рыхтуюць кліентаў да паездкі ў Беларусь. На мінулым тыдні падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве, — падзяліўся Дзмітрый Марозаў, дадаўшы што і ў такім экзатычным месцы, дзе прынята праводзіць адпачынак, ёсць людзі, якія зацікавіліся медыцынскім турызмам у нашай краіне.

Ён адзначыў, што лячэбна-аздараўленчы турызм больш масавы, чым медыцынскі. Але апошні патрабуе развіцця спадарожных відаў — пражывання, экскурсійнага абслугоўвання, трансфераў і іншага.

У лячэбна-аздараўленчым шмат зваротных турыстаў, якія выбіраюць упадабаны санаторый і вяртаюцца туды раз за разам.

— Бываюць цікавыя выпадкі, калі госці жывуць на працягу доўгага часу. Жанчына здавала ў арэнду сваю кватэру ў Санкт-Пецярбургу і жыла ў беларускім санаторыі. Яе ўсё задавальняла: і абслугоўванне, і медыцынскія паслугі, — прывёў прыклад Дзмітрый Марозаў.

## КАРДЫЯЛОГІЯ, АНКАЛОГІЯ, ТРАНСПЛАНТАЛОГІЯ

Як адзначыў **начальнік аддзела інфармацыі і сувязі ААТ «Медыцынская ініцыятыва» Аляксандр ТРУС**, медыцынскі турызм у нашай краіне набірае абароты. Аднак гэта нішавая і самая складаная галіна турызму, якая патрабуе індывідуальнага падыходу да кожнага.

Самымі запатрабаванымі ён назваў такія кірункі медыцынскага турызму, як лячэбны, дыягнастычны, эстэтычны. І дадаў, што цяпер змяняецца геаграфія медыцынскіх турыстаў.

— Як і раней, захоўваецца асноўная плынь гасцей з краін СНД, у прыватнасці з Расіі. Пры гэтым моцна павялічылася колькасць турыстаў з Кітая. У 2023 годзе было нямала гасцей з Босніі і Герцагавіны, Сербіі, Грузіі. Дзякуючы візавай палітыцы шмат людзей прыязджае за атрыманнем медыцынскай дапамогі з Латвіі і Літвы. Не змяншаецца плынь медыцынскіх турыстаў з краін СНД: тут адзначу такія краіны, як Казахстан, Узбекістан, Туркменістан, — расказаў Аляксандр Трус.

У 2023 годзе найбольшым попытам у замежных грамадзян карысталася медыцынская дапамога па кардыялогіі, анкалогіі, афтальмалогіі, нейрахірургіі, хірургіі. Класічная стаматалогія традыцыйна з'яўляецца мекай медыцынскага турызму ў Беларусі. Па эканамічных паказчыках лідзіруюць такія кірункі, як трансплантaлогія і гематалогія: як вядома, наша краіна ўваходзіць у топ краін па трансплантацыі касцявога мозгу і органаў. Попытам у замежных грамадзян карыстаюцца пластычныя і барыятрычныя аперацыі.

— Мы бачым, што развіццё медыцыны ў нашай краіне садзейнічае развіццю медыцынскага турызму, нягледзячы на тое што напрамак з'яўляецца нішавым. Да нас едуць за безумоўнай якасцю, сістэме аховы здароўя Беларусі давяраюць, прычым давяраюць гадамі, давяраюць сям'і. Гэты кірунак варта ўключаць у турыстычныя комплексы і прадаваць як турыстычныя паслугі, — выказаў меркаванне Аляксандр Трус.

Установы аховы здароўя Мінска ўжо распрацоўваюць стандартызаваныя праграмы, напрыклад, «Жаночае здароўе», «Жаночае здароўе 25+», «Жаночае здароўе 50+», комплексныя чэк-апы. Кожны чалавек іх можа прайсці, прыязджаючы ў Беларусь у госці, у дзелавую паездку, на экскурсію, за адзін-тры дні за адносна невялікія грошы. Ёсць госці з іншых краін, якія прыязджаюць у Беларусь на тры-сем дзён наведаць культурна-гістарычныя лакацыі, і за гэты час атрымліваюць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. А потым вяртаюцца з сем'ямі за цэлым комплексам медыцынскіх паслуг.

— Нягледзячы на тое што медыцынскі турызм сутыкаецца з большымі цяжкасцямі, чым любы іншы від турызму, гэты кірунак апошнія пяць гадоў застаецца не толькі перспектыўным, але і актыўна развіваецца арганізацыямі нашай краіны. Гэта ствараe перадпасылкі не толькі для абслугоўвання замежных грамадзян, але і падцягвае сістэму ў цэлым, паляпшаючы якасць медыцынскай дапамогі грамадзянам нашай краіны, — рэзюмаваў Аляксандр Трус.



Градзірня ў «Прыазёрным».



Басейн з мінеральнай вадой у санаторыі «Прыазёрны».

## НЕ ГОРШ, ЧЫМ НА КУРОРЦЕ

Амалоджваецца і мяняецца аўдыторыя беларускіх здраўніц. Калі раней гэта былі пераважна людзі пенсіённага ўзросту, то цяпер шмат наведвальнікаў сярэдняга ўзросту. Паводле інфармацыі **намесніка генеральнага дырэктара ААТ «Белагразддраўніца» Віктара ПАНАМАРОВА**, наведвальнікі ад 30 да 59 гадоў складаюць 49 %, ад 60 да 80 — 40 %.

У структуры таварыства восем санаторыяў, у тым ліку чатыры дарослыя: «Радон» (Дзятлаўскі раён), «Парэчча» (Гродзенскі раён), «Рассвет-Любань» (Любанскі раён), «Сасновы бор» (Маладзечанскі раён) і дзіцячыя «Случ», «Сонейка», «Расінка» і «Налібоцкая пушча». Іх фонд — 2850 ложкаў.

Як расказаў Віктар Панамароў, стаўка ў здраўніцах робіцца на ўнікальныя прыродныя фактары. Мінеральныя радонавыя воды санаторыя «Радон» па сваім саставе блізкія да вады на знакамітых курортах Бадэн-Бадэна (Германія) і Яхімаў (Чэхія). Санаторый «Парэчча», які знаходзіцца ў 11 км ад Друскінінкая, карыстаецца падобнай вадой, якая выдатна падыходзіць для лячэння страўнікава-кішачнага тракта. Унікальная мінеральная вада і ў санаторыі «Рассвет-Любань», па саставу яна блізкая да трускавецкай. «Фішкай» санаторыяў з'яўляюцца і ўласныя сапрапелевыя гразі, яшчэ адзін унікальны прыродны фактар.

З Інстытутам фізіялогіі тут ствараюць свае тэхналогіі лячэння і аздараўлення, у прыватнасці, спелеакліматалячэбніцы, што карысна для людзей з алергіямі, захворваннямі верхніх дыхальных шляхоў, а таксама бурштынавая аэраіонатэрапія. Знаходжанне ў бурштынавым пакоі суправаджаецца ўдыханнем бурштынавай кіслаты, што карысна для ўмацавання імунітэту і пры пастковідным сіндроме. Выкарыстоўваецца і такая цікавая працэдура, як бурштынавы масаж ступняў.

Унікальная працэдура — «Сон на вуллях» — прымяняецца ў санаторыі «Сасновы бор». 40 хвілін такога адпачынку пад гудзенне пчол з удыханнем прадуктаў пчалярства маюць псіхатэрапеўтычны эфект, а таксама карысныя пры самых розных захворваннях — ад сардэчна-сасудзістых і нервовых да хвароб стрававальнай сістэмы, алергіяў і мігрэняў. Біярытмы пчол і здаровага чалавека ідэнтычныя. Арганізм хворага чалавека, знаходзячыся ў прасторы з велізарнай біяэнергетыкай пчалінай сям'і, падладжваецца пад гэты эталон, і хвароба адступае.

Сёння санаторыі ААТ «Белагразддраўніца» актыўна развіваюць СПА-паслугі, касметалогію, бо да 75 % наведвальнікаў — жанчыны. Каля 45 % наведвальнікаў — расіяне. Ёсць госці і з дальняга замежжа — Германіі, Галандыі, Ізраіля, ЗША, Казахстана, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Польшчы, Украіны, Фінляндыі.

## КОМПЛЕКС ЛАЗНЯЎ, САЛЯНАЯ ГРАДЗІРНЯ І ПОЛЕ ДЛЯ МІНІ-ГОЛЬФА

Госці з 25 краін свету пабывалі летась у санаторыі «Прыазёрны», што размешчаны на беразе возера Нарач. Пры гэтым 60 % адпачывальнікаў — беларусы. Астатнія амаль 40 % — госці з Расіі. Ёсць тут і госці з краін Балтыі, якія прыязджаюць у нашу краіну па бязвізе, і з Азербайджана.

— Больш за 30 % нашых наведвальнікаў — пастаянныя госці, якія былі ў нас ад двух да 10 разоў. Больш за тысячу чалавек правялі ў нашым санаторыі 100 дзён і больш, некаторыя нават у год прыязджаюць па некалькі разоў, — расказаў **дырэктар Рэспубліканскага санаторна-курортнага ўнітарнага прадпрыемства «Санаторый «Прыазёрны» Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Сяргей НЕХВЯДОВІЧ.**

Здраўніца ўваходзіць у топ-3 у Беларусі па ўмяшчальнасці і разлічана на 460 месцаў (каля 300 нумароў). Што ж трэба, каб іх запоўніць наведвальнікамі?

— У нашым санаторыі і ў галіне ў цэлым назіраюцца такія тэндэнцыі, як амалоджванне гасцей і змяненне аўдыторыі. Людзі, якія раней адпачывалі толькі ў Турцыі і Егіпце, перагледзелі сваё стаўленне і зразумелі, што ў санаторыі можна адпачыць не горш. Адсюль павышаецца патрабаванне да сэрвісу: тыя людзі, якія маюць вопыт адпачынку на сусветных курортах, свае патрабаванні распаўсюджваюць на санаторыі, і мы стараемся развівацца ў адпаведнасці са стандартамі гасціннасці, прынятымі ў свеце. Таксама ёсць запыт на адпачынак з дзецьмі. Трэнд апошніх пяці гадоў — расце попыт на туры выхаднога дня. Яшчэ адзін трэнд — зніжэнне сезоннасці, — пералічвае змены ў настроях наведвальнікаў Сяргей Нехвядовіч.

Санаторыям прыходзіцца адпавядаць новым патрабаванням. Сёння «Прыазёрны» — цалкам сучасны санаторый са СПА-цэнтрам, дзе маецца басейн з мінеральнай вадой, а таксама пясчаны і васкавы пакоі, асноўны басейн з комплексам лазняў (фінскай, рускай, турэцкай і пакоем з ільдом), трыма кафэ, боўлінгам, танцавальным клубам, велнес-цэнтрам, полем для міні-гольфа. Сёлета на возеры Нарач быў абсталяваны ўласны пляж у адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі.

Унікальным аб'ектам на тэрыторыі Беларусі з'яўляецца саляная градзірня «Прыазёрнага». Мінеральная вада з трохметровай вышыні сцякае па бярозавых галінках, выпарваючыся і распыляючыся, утвараючы такім чынам прыродны інгалятарый. Адпачывальнікі могуць неабмежаваны час удыхаць насычаное іонамі солі паветра, падобнае па саставе да марскога.

Таксама на тэрыторыі санаторыя абсталяваная дарожка Кнэйпа з камянямі рознай фракцыі для хаджэння басанож і басейнам з мінеральнай вадой.

Нумары, а яны на розны густ: ад адна- да трохпакаёвых, — абсталяваны вадкакрышталічнымі тэлевізарамі, халадзільнікамі, Wi-Fi. У міжсезонне яны каштуюць ад 179 рублёў у суткі. Харчаванне арганізавана па тыпе шведскага стала, але адрозніваецца ад рацыёну ў атэлях і на курортах, бо тут захоўваецца дыетычная скіраванасць. Ёсць нават безглютэнавыя і безлактозныя стравы.

У санаторыі даступныя каля 100 відаў медыцынскіх паслуг — ад традыцыйных масажу, электра- і водалячэння да сучасных азонатэрапіі, карбоксітэрапіі, крыятэрапіі, вакуумна-ўдарна-хвалевай тэрапіі. «Прыазёрны» прапануе розныя віды адпачынку: як па класічных санаторна-курортных пуцёўках, так і туры выхаднога дня са СПА ці медыцынскім напаўненнем, комплексныя медыцынскія праграмы, у прыватнасці, такія як «Антыстрэс», «Школа стройнасці», «Сексуальная гармонія», «Здаровы сон», «Здаровы кішэчнік» і іншыя.

Алена КРАВЕЦ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# ПРЫТУЛАК ДЛЯ ТЫХ, ХТО АПЫНУЎСЯ Ў БЯДЗЕ

## Астравок бяспекі

Сінгх і Каур не ведаюць англійскай мовы, размову вядзём праз мабільны перакладчык з рускай мовы на хіндзі. Даведваюся, што сям'я накіроўвалася ў Германію, іх падманулі, сужэнцы трапілі ў непрыемную сітуацыю і засталіся без дакументаў. У крызісны цэнтр іх накіравала міграцыйная служба. Грамадзяне Індыі чакаюць, калі ім зробяць пашпарты. Цяпер яны на поўным забеспячэнні Чырвонага Крыжа.

— У Індыі засталіся нашы бацькі і родныя, якія вельмі перажываюць за нас, — кажа Каур. — Мы з нецярпеннем чакаем моманту, калі зможам вярнуцца назад і абняць іх. І калі б не Чырвоны Крыж, напэўна, не змаглі б з імі сустрэцца. Мы вельмі ўдзячны арганізацыі за тое, што дала нам прытулак. У нас нават грошай няма.

Да лістапада мінулага года ў Магілёве не было крызіснага цэнтра ўвогуле, а офісныя памяшканні абласной і раённых місій Чырвонага Крыжа знаходзіліся па розных адрасах. Пасля таго як арганізацыя атрымала памяшканне былой дзіцячай паліклінікі плошчай амаль 500 квадратных метраў, магчымасці значна пашырыліся.

**«Чырвоны Крыж заклікае далучыцца да добрай справы ўсіх — насельніцтва, арганізацыі, прадпрыемствы. Заўсёды ёсць патрэба ў адзенні, абутку, прадуктах харчавання, санітарных сродках».**

**Старшыня Кастрычніцкай раённай арганізацыі Чырвонага Крыжа**, а па сумяшчальніцтве яшчэ і **куратар па крызісным цэнтры Андрэй ВІГУРА** паказвае ўмовы пражывання для мігрантаў. У іх распараджэнні чатыры пакоі, кухня, душавыя, санвузел. У пакоях новая камфортная мэбля, у памяшканнях агульнага карыстання сучасная бытавая тэхніка. У санітарным пакоі, напрыклад, усталяваны пральная і сушыльная машыны. На кухні — электрапліта, у шафах — набор розных круп і макароны, у халадзільніку — кансервы і іншыя прадукты.

Па суседстве — памяшканні для правядзення розных трэнінгаў і семінараў, бяспечная прастора для дзяцей — так званая аранжавая зона. Тут створаны ўмовы, каб яны маглі пазбавіцца ад стрэсу, які атрымалі. Пры неабходнасці з непаўналетнім можа папрацаваць псіхолаг і іншыя спецыялісты.

У крызісным цэнтры могуць аднамомантна размясціцца да 15 чалавек, перыяд пражывання складае месяц. З часу адкрыцця яго паслугамі скарысталіся восем чалавек. Нядаўна ён быў прытулкам яшчэ і для сям'і з Данбаса — Артура, Аксаны і дзвюх іх дачок. Сужэнцы ўжо атрымалі рэгістрацыю і пераехалі на здымнае жыллё. Артур па прафесіі будаўнік, Аксана — цырульнік, будзе рабіць прычоскі магіляўчанкам. А яшчэ яна выказала жаданне рабіць сацыяльныя стрыжкі ўразлівым катэгорыям насельніцтва. Пасля таго што яе сям'я перажыла, жанчына поўная рашучасці стаць валанцёрам і дапамагаць іншым.

## Не толькі замежнікі

Дапамога мігрантам — адзін з найважнейшых кірункаў работы Чырвонага Крыжа, адзначае **старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Андрэй МАРТЫНОЎСКІ.**

— Гэта людзі, якія засталіся без жылля, маёмасці, і ім вельмі неабходныя дапамога і падтрымка, — кажа ён. — Мы ім дапамагаем прадуктамі харчавання, сродкамі гігіены, адзеннем. Аказваем псіхасацыяльную падтрымку, садзейнічаем аднаўленню сямейных сувязяў, дапамагаем знайсці жыллё, работу. Для мігрантаў вельмі неабходна часовае жыллё. І стварэнне крызіснага цэнтра значна павысіла якасць гэтай дапамогі. Людзі атрымліваюць не толькі магчымасць часова пажыць на тэрыторыі цэнтра, але і скарыстацца кансультатыўнай або псіхалагічнай падтрымкай.

Часовы прытулак гарантаваны не толькі мігрантам або бежанцам, але і беларусам, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі.

— Напрыклад, згарэў дом — няма дзе жыць, і чалавек можа звярнуцца да нас, — кажа Андрэй Уладзіміравіч. — Мы арыентаваны на ўсю вобласць. Можам пасяліць чалавека і з раёна. У кожным раёне ёсць наша прадстаўніцтва, і пацярпелы мае магчымасць звярнуцца да нашага прадстаўніка або непасрэдна да нас. Пра наш крызісны цэнтр ведаюць і партнёры з МНС, сацыяльнай службы.

За 2022—2023 гады Магілёўская арганізацыя Чырвонага Крыжа аказала дапамогу 362 мігрантам з Украіны. Прытулак атрымалі дзевяць мігрантаў з Афганістана, Самалі, Эфіопіі, якія сёння жывуць у Індыі. Жанчына з Эфіопіі трапіла ў крызісны цэнтр на апошніх днях цяжарнасці. Ёй дапамаглі ў родах і забяспечылі ўсім неабходным.

— А яшчэ мы аказваем дапамогу мігрантам, якія знаходзяцца ў ізалятарах часовага ўтрымання за парушэнне міграцыйнага заканадаўства, — удакладняе суразмоўнік. — Наведваем іх, даём магчымасць трымаць мабільную сувязь з роднымі, забяспечваем прадуктамі харчавання, гігіенічнымі сродкамі.

Добрай традыцыяй стала правядзенне абласнога валанцёрскага форуму на базе Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі раз на два гады. Тут людзі вучацца, дзеляцца вопытам, знаёмяцца адзін з адным.



Арганізацыя аказвае не толькі маральную і гуманітарную дапамогу — дае часовы прытулак і дапамагае знайсці работу. Пры ўдзеле міжнародных партнёраў па лініі Міжнароднай федэрацыі Чырвонага Крыжа, Міжнароднага камітэта ЧК пацярпелыя атрымліваюць яшчэ і грашовую дапамогу. Летась грамадзянам Украіны былі выдзелены сродкі на суму больш чым 200 тысяч рублёў.

— Гэта дапамога часовая, выдаецца на першых парах, каб чалавек працаўладкаваўся і меў магчымасць сам зарабляць грошы, — удакладняе суразмоўнік.

Чырвоны Крыж заклікае далучыцца да добрай справы ўсіх — насельніцтва, арганізацыі, прадпрыемствы. Заўсёды ёсць патрэба ў адзенні, абутку, прадуктах харчавання, санітарных сродках. Пэўны час у адным з буйных гандлёвых цэнтраў Магілёва стаяў кантэйнер для збору адзення ад Чырвонага Крыжа. Але людзі панеслі туды ўсё, што шкада было выкінуць на сметнік. Новага там наогул нічога не было, як і цацак, канцылярскіх вырабаў. Пры гэтым сам кантэйнер быў завалены пакетамі з непатрэбнымі гараджанам рэчамі. Прыйшлося яго прыбраць, каб ён не псаваў сваім выглядам прастору. Ахвотныя дапамагчы могуць звяртацца напрост у арганізацыю Чырвонага Крыжа. Але адзенне павінна быць новым або амаль новым. У першую чаргу ёсць патрэба ў зімовым адзенні для мужчын вялікіх памераў, дзіцячых рэчах.

## Клоўнатэрапія

У Лізы Сень вельмі рэдкая спецыяльнасць — трэнер па клоўнатэрапіі. Яна не аніматар, не цыркавы клоўн — яна менавіта той светлы анёл, побач з якім цяжкахворым дзеткам становіцца крыху лягчэй.

— Калі даведалася, што ёсць пры Чырвоным Крыжы такая форма работы, захацела гэтым займацца, — расказвае яна. — Пайшла на трэнінг, дадала ў чат хлопцаў і дзяўчат, якія маглі б стаць мне патэнцыяльнымі памочнікамі па справе, ездзіла на навучанне ў Мінск, запрашала ў Магілёў трэнера па клоўнатэрапіі. Цяпер у мяне свая каманда.

— Ніколі не забуду наш першы выхад у аддзяленне гематалогіі дзіцячай абласной бальніцы, — успамінае Ліза. — У нас няма плана або выразнага сцэнарыя. Гэтым мы адрозніваемся ад аніматараў і цыркавых клоўнаў. Мы павінны хадзіць па палатах, а нас запрасілі ў гульнявую, дзе было шмат дзяцей. Дзякуй маім памочнікам, што не разгубіліся. Спачатку займаліся ўсімі разам, потым размеркаваліся па групках.

Задача клоўнатэрапеўтаў — не проста забаўляць дзяцей, а яшчэ і суправаджаць іх. Яны працуюць з тымі, хто знаходзіцца ў аддзяленні траўматалогіі, гематалогіі і анкалогіі. Там, дзе найбольш цяжкія.

— Наша галоўная мэта — не шкадаваць дзяцей, а адцягваць іх увагу ад усяго дрэннага, што адбываецца, — расказвае Ліза. — Ім жалю і без нас хапае. Наша задача — падарыць ім радасць хоць на 10 хвілін, каб яны забыліся пра ўсё, што іх прыгнятае. Пры гэтым нельга паддавацца эмоцыям, паказваць свае слёзы. Дзеці ўсё адчуваюць. Тут павінна працаваць правіла: не нашкодзь.

Ліза таксама курыруе маладзёжны клуб па міжнародным гуманітарным праве МДУ імя А. Куляшова, у які ўваходзяць 18 чалавек. Пішуць розныя навуковыя работы, удзельнічаюць у конкурсах. Клуб з'яўляецца арганізатарам абласных семінара і квізу па міжнародным гуманітарным праве сярод ВНУ вобласці.

## Пры надзвычайнай сітуацыі

Свежая вада ў спякотныя летнія дні, гарачы чай у перыяд моцных зімніх маразоў — гэта таксама работа Чырвонага Крыжа, але ўжо прафілактычная. Як напамін пра тое, што не трэба забываць надзяваць шапку, сачыць за водным балансам. Місія Чырвонага Крыжа па рэагаванні на надзвычайныя сітуацыі больш грунтоўная.

**Спецыяліст аддзела рэагавання на надзвычайныя сітуацыі Аліна МАМОШКА** ў якасці кіраўніка групы валанцёраў выязджала на беларуска-польскую граніцу падчас міграцыйнага крызісу.

**«Часовы прытулак гарантаваны не толькі мігрантам або бежанцам, але і беларусам, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Напрыклад, згарэў дом — няма дзе жыць, і чалавек можа звярнуцца да нас, — кажа Андрэй Уладзіміравіч. — Мы арыентаваны на ўсю вобласць. Можам пасяліць чалавека і з раёна».**

— Спачатку мы дастаўлялі гуманітарны груз, а потым спатрэбілася наша дапамога ў рабоце з мігрантамі, — расказвае яна. — Некалькі разоў ездзілі туды на тыднёвыя дзяжурствы. Жылі ў транспартна-лагістычным цэнтры на пагранпераходзе «Брузгі», дзе звычайна прыпыняюцца дальнабойшчыкі. Трэба было падымацца ў 8 гадзін раніцы і карміць бежанцаў. Па адзін бок жылі жанчыны ў вялікай палатцы, па другі — мужчыны. У 8 раніцы дзве вялікія чаргі выстройваліся па харчаванне. Гатоўкай ежы займалася іншая структура, мы ў асноўным выдавалі яе мігрантам. Звярталі ўвагу на тое, што прыярытэт мелі мужчыны. Жанчыны і дзеці давалі ім магчымасць паесці ў першую чаргу, потым елі самі. У вольны час займаліся з дзецьмі, гулялі з імі ў мяч, малявалі.

Суразмоўца ўспамінае таксама пра ўдзел у аперацыі па аказанні дапамогі хасідам на ўкраінска-беларускай граніцы на Гомельшчыне. Вернікаў не прапускалі ва Украіну ў сувязі з ковідам. Аліна тады была яшчэ валанцёрам, прызнаецца, што працавалі вельмі напружана, а начавалі ў вялікагрузных машынах МНС на раскладушках.

Дапамога магілёўскай арганізацыі спатрэбілася і калі ва Украіне прапалі беларускія дальнабойшчыкі.

— Да нас звярталіся іх родныя, і мы працавалі з імі, — удакладняе Аліна.

## Сёстры міласэрнасці

Часцей за ўсё доглядам інвалідаў і цяжкахворых людзей займаецца сацыяльная служба. Але і Чырвоны Крыж не застаецца ўбаку. **Спецыяліст па медыцынска-сацыяльнай службе Лідзія ЗАХАРЭНКА** расказвае, што сёстры міласэрнасці бяруць на сябе ўвесь цяжар догляду гэтых хворых — мыюць іх, дапамагаюць ажыццяўляць санітарна-гігіенічныя працэдуры.

— Працуем па заказах ад райвыканкамаў, даглядаем у асноўным інвалідаў I-II груп, — расказвае суразмоўца. — Летась абслугоўвалі 66 чалавек. Нашы сёстры міласэрнасці паспяваюць даглядаць адразу некалькіх кліентаў. Ды яшчэ, бывае, сваіх знаёмых і родных прыцягваюць да дзейнасці ў якасці валанцёраў. Для большасці з нашых супрацоўніц гэта работа для душы. Бо грошы за яе яны атрымліваюць сімвалічныя. Людзі спачуваюць бядзе незнаёмых так, што, нават калі патрэба ў іх паслугах заканчваецца, працягваюць з імі кантактаваць. Я працую тут не так даўно, і мяне вельмі ўразіла, як адна наша сястра міласэрнасці плакала, калі памерла яе падапечная.

У вобласці на 9 лютага працавала сёстрамі міласэрнасці тры чалавекі за членскія ўзносы Чырвонага Крыжа, а калі адкрыюцца дзяржзаказы, дадасца яшчэ некалькі чалавек. Попыт жа на іх паслугі перавышае прапанову. І служба вельмі зацікаўлена ў валанцёрах. Магчыма, хтосьці гатовы ўзяць на сябе такі цяжкі, але вельмі гуманны крыж?

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**Фота Таццяны ПАДЛІПСКАЙ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении открытого аукциона
по продаже имущества, принадлежащего
**РУП «Белсоюзпечать»** (Продавец)
на праве хозяйственного ведения

Аукцион состоится **12.03.2024 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

**Лот № 1, в составе:** 1) грузовой фургон ГАЗ 3302, кузов (рама) № 33020080520818/ 33020082314868; 2) грузовой фургон ГАЗ 3302, кузов (рама) № 33020080520831/ 33020082314876.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 609,38 руб.

**Лот № 2:** грузовой фургон GAZ-3302 KUPAVA 232500, кузов (рама) № 330200A0581717/ 330200A2384163.
Начальная цена с НДС 20 % – 3 349,21 руб.

**Лот № 3:** грузовой фургон GAZ-3302 KUPAVA 232500, кузов (рама) № 330200A0581692/ 330200A2383922.
Начальная цена с НДС 20 % – 3 347,40 руб.

**Лот № 4:** грузовой фургон Renault Kangoo, кузов (рама) № VF1FC0JAF24852367.
Начальная цена с НДС 20 % – 3 835,73 руб.

**Место нахождения Лотов №№ 1–4**:
г. Минск, Лукьяновича, 12.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Государственного комитета по имуществу gki.gov.by и на электронной торговой площадке «GOSTORG» Организатора аукциона (gostorg.by).

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)** извещает
о проведении повторного открытого аукциона
по продаже имущества, принадлежащего
**ОАО «Дорстройиндустрия» (Продавец)**

Аукцион состоится **27.02.2024 в 14.00** по адресу:
г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:** грузопассажирский комби PEUGEOT PARTNER, кузов (рама) № VF3GJWJYB8J081375.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 7 200,00 руб.
**Задаток** – 1 000,00 руб.

**Лот № 2:** легковой хэтчбек SKODA OCTAVIA, кузов (рама) № TMBBD41Z072061963.
**Начальная цена с НДС 20 %** – 14 040,00 руб.
**Задаток** – 1 700,00 руб.

**Место нахождения Лотов №№ 1–2:** Минская обл., Дзержинский р-н, г. Фаниполь, ул. Заводская, 19.
Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by).

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатков – 23.02.2024 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Центр Промышленной Оценки

**• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ**
**• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1607 |
| **Продавец** | ОАО «БЕЛХИМ», Минская обл., Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Рефрижераторный контейнер б/у Carrier ML-2i, 40 фут.,** инв. № 9384 | **23 358,00** |
| 2 | **Рефрижератор-контейнер б/у Carrier 2000 г. в., 40 фут.,** инв. № 9468 | **23 358,00** |
| 3 | **Рефрижераторный контейнер б/у Carrier ML-2i, 20 фут.,** инв. № 9388 | **19 686,00** |
| 4 | **Машина для перемотки стретч-пленки модели RES-04, 2011 г. в.,** инв. № нф00019 | **20 400,00** |
| 5 | **Автопогрузчик ДВ 1792.33.10**, инв. № 120410 | **3 300,00** |

Цены снижены по лотам №№ 1–4 на 15 %, по лоту № 5 – на 75 %

**Местонахождение:** лоты №№ 1–3 – Минский р-н, аг. Колодищи, ул.Чкалова, 58; лоты №№ 4, 5 – Дзержинский р-н, Фанипольский с/с, 19

**Задаток 10 % от начальной цены** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 15 календарных дней** после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов:** 100 % оплата стоимости в течение **10 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **4 %** по лотам №№ 1–4 и **7 %** по лоту № 5 от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения электронных торгов

Предыдущие публикации извещения в газете «Звязда»: по лотам №№ 1–4 от 22.12.2023, по лоту № 5 – от 27.10.2023

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 22.02.2024 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок** заявки на участие в электронных торгах принимаются **по 21.02.2024 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17 310-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

Утерянные квитанции 1-СУ ЗАСО «Белнефтестрах» серии ВА 3919199, 4864591, 4864592, 7439554 и бланки строгой отчетности по ДС от НС и болезней на время поездки за границу серии НВБ 935095, 942714 **считать недействительными.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу филиал**
**«Центральный рынок»**

**Аукцион состоится 29.02.2024 г. в 11.00**
**по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209.**
**Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-7508 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин) общей площадью 956,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129622 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – тепловая сеть) протяженностью 24,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, тепловая сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129623 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 57,6 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129625 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть) протяженностью 190,3 м, расположенное по адресу: г. Гродно, водопроводная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129624 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 159,7 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию магазина по ул. Максима Горького, 55;<br>- капитальное строение с инвентарным номером 400/С-129627 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть) протяженностью 26,8 м, расположенное по адресу: г. Гродно, канализационная сеть к зданию туалета по ул. Максима Горького, 55;<br>- сеть энергоснабжения;<br>- оборудование: вагончик строительный, комплект регулирования температуры, набор мебели, насос «Грундфос УРС24*40», охранно-пожарная сигнализация, павильон из металлоконструкций, регулятор распределения тепловой энергии, регулятор расхода теплоэнергии МИР 9701, система видеонаблюдения, система пожарной сигнализации; теплосчетчик ТЭМ-104 Ду-15; торговое оборудование (стеллаж, стол для торговли); торговый павильон (5 шт.); торговый павильон 3,2 м (2 торговых места 1,6*1,6); кондиционер настенный (2 шт.); лифт грузовой; пожарная сигнализация; холодильная камера GOLD; холодильная камера склад.<br>Лот 1 имеет обременения со стороны третьих лиц в виде аренды с собственниками павильонов и мест для торговли; прохождение по территории рынка теплотрассы к зданию ООО «Фирма Мока», на которой расположены павильоны и роллеты, в том числе находящиеся в собственности арендаторов |
| **Начальная цена продажи** | 1 004 331,00 руб. (один миллион четыре тысячи триста тридцать один рубль) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 100 433 руб. (сто тысяч четыреста тридцать три рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 27.02.2024 г. до 15.00** |

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 28.12.2022 г.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsionykopiya

**28 февраля 2024 г.** **№ 1-Н/2024**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ
### по продаже не завершенных строительством жилых домов, дач с продажей права аренды земельного участка в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта/ адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение/ срок аренды | Кадастровые номер, площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку док-ции, руб. | Наличие ограничений, обременений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи, У-2372 (по генплану) | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома/ 99 лет | 340100000008004298, 0,0871 га | 33 442,15 | 6 354,00 | 5 320,02 | Зона санитарной охраны водопроводных сооружений, охранная зона объектов газораспределительной системы, обременения: присутствие фундамента, строительного мусора, капитального не завершенного строительством сооружения |

1. Организатор аукциона – коммунальное топографо-геодезическое унитарное предприятие «Гомельгеодезцентр».

2. **Аукцион проводится комиссией, созданной Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр», в соответствии с Положением «О порядке продажи не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов» на земельном участке в г. Гомель, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220.**

3. **Аукцион состоится 28 февраля 2024 г. в 14.30 в Гомельском городском исполнительном комитете по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 16,** при наличии не менее двух участников. Если заявление на участие подано только одним гражданином Республики Беларусь, право аренды земельного участка предоставляестя этому лицу при его согласии с внесением платы за право аренды в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на **5 процентов.**

4. К участию в аукционе допускаются граждане Республики Беларусь, индивидуальные предприниматели и юридические лица. В аукционе допускается участие на стороне покупателя консолидированных участников, подавших в Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр» в указанные в извещении сроки следующие документы: заявление по установленной форме; документ, подтверждающий внесение суммы задатка в размере, указанном в извещении с отметкой банка, на **р/с BY74 BAPB 3012 2030 8001 3000 0000 в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30, УНП 400230163, БИК BAPBBY2X. Получатель платежа – Государственное предприятие «Гомельгеодезцентр». Наименование платежа – оплата задатка за участие в аукционе. Кроме того, НЕОБХОДИМО открыть текущий расчетный счет (с указанием транзитного счета) в ЦБУ № 301 ОАО «Белагропромбанк» г. Гомель, ул. Интернациональная, 30 – для возврата задатка за участие в аукционе (в случае непобеды на аукционных торгах).**

**Перечень документов, представляемых участником:**

4.1. Заявление на участие в аукционе; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; **гражданам Республики Беларусь** – копия паспорта, **представителем гражданина** – нотариально удостоверенная доверенность;

4.2. Представители или уполномоченные должностные лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов.

5. Лицо, желающее принять участие в аукционе, обязано подписать с организатором торгов Соглашение, определяющее взаимные права, обязанности и ответственность сторон, в процессе подготовки и проведения аукциона.

6. **Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление предмета аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан:**

6.1. В течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся в размере, определенном соответствующим протоколом аукционных торгов:

- часть оплаты предмета аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке за земельный участок), за вычетом суммы, причитающейся за не завершенный строительством незаконсервированный одноквартирный жилой дом;

- часть платы за предмет аукциона – цена продажи не завершенного строительством незаконсервированного одноквартирного жилого дома, исчисленную пропорционально его удельному весу в начальной цене предмета аукциона, за вычетом расходов, понесенных на оплату оценки;

- возместить расходы, понесенные городским бюджетом по изготовлению земельно-кадастровой документации и государственной регистрации земельного участка;

- компенсировать организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения (окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников).

6.2. После совершения победителем аукциона действий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка, и представления организатору аукциона и в местный исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее двух рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона местный исполнительный комитет заключает договор аренды земельного участка.

7. **Заявления для участия в аукционных торгах принимаются Государственным предприятием «Гомельгеодезцентр» с 12 по 26 февраля 2024 г. включительно. Дни приема: _понедельник, среда, пятница_ с 08.00 до 16.30 (обед 12.00–13.00) по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, 149, 3-й этаж, каб. 3-6, 3-14. Контактный телефон +375 232 30-12-46.**
**Информация размещена на сайтах: www.geodezcentr.by, gomeloblzem.by, gki.gov.by, газета «Звязда», «Гомельские ведомости».**

# КОКА-КОЛА ЗАМЕСТ ВАДЫ, СУХАЯ СУМЕСЬ ЗАМЕСТ МАЛАКА

## Як карпарацыі бяруць нас у «заложнікі»



**Усе мы маем шкодныя звычкі і не задумваемся, адкуль яны з'явіліся і кім навязаныя. Сярод іх — цяга да салодкага. Між тым, ніхто сёння не можа дакладна палічыць, колькі цукру мы ўжываем, бо ён не толькі ў цукерках і шакаладзе, а нават у каўбасах, сасісках і іншых паўфабрыкатах. А за распаўсюджваннем салодкага стаяць магутныя карпарацыі, якія і прымушаюць нас стаць цукровымі наркаманамі.**

**Як вытворцы салодкіх напояў і дзіцячых сухіх сумесяў захапілі свет, расказвае нейрахірург, навуковы супрацоўнік аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчык кафедры неўралогіі і нейрахірургіі Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў аховы здароўя Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта Гумен ГАРБАННІДЖАД.**

— Варта сказаць, што вялікі бізнес заўсёды ўплывае на палітыку. А палітыка ўплывае на лад жыцця людзей. І дзеля таго каб адзінкавыя людзі мелі вялікі даход і не страцілі свой уплыў, насельніцтва, пачынаючы ад дзяцей да сталага пакалення, і нават цэлыя суверэнныя краіны пакутуюць. Часам дзеянні гіганцкіх карпарацый і палітыкаў чымсьці падобныя на дзеянні вар'ятаў, да якіх медыцына і навука не можа дабрацца.

***— Сёння, у стагоддзе інтэрнэту, гэта складана ўявіць...***

— Такіх прыкладаў можна знайсці шмат нават у XXI стагоддзі, у прыватнасці, гэта праблема цукру і кампаній, якія робяць на ім даход. Ні для каго не сакрэт, што найбуйнейшыя кампаніі, якія робяць бізнес на цукры, гэта «Кока-Кола» і «Нестле». Усе мы ведаем іх знакамітыя напоі і шакалад. Цукар з дапамогай гэтых кампаній змяніў наша жыццё, здароўе дзяцей, і, як ні дзіўна, нават паўплываў на рэлігійныя традыцыі некаторых нацый.

У цукры няма ніводнай карыснай для здароўя ўласцівасці. Нашымі продкамі ён выкарыстоўваўся рэдка і не ўваходзіў у іх рацыён харчавання. Багатыя людзі не елі цукар, а выраблялі з яго скульптуры, якімі ўпрыгожвалі стол. Рэзка павялічылася ўжыванне цукру пасля Другой сусветнай вайны. І даследчыкі заўважылі, што вырасла смяротнасць ад сардэчна-сасудзістых захворванняў, яе можна было параўноўваць са смяротнасцю ад інфекцыйных хвароб, а тады яны была высокай, бо яшчэ не існавала эфектыўных антыбіётыкаў. Вучоныя прыйшлі да высновы, што вінаваты ў гэтым цукар.

Вытворцаў цукру гэта, безумоўна, напружвала. Яны наўпрост пачалі падкупляць вучоных, каб тыя не проста не пісалі пра шкоду цукру, а заяўлялі, што ён мінімальна ўплывае на наша здароўе. А ў залішняй колькасці смерцяў ад сардэчна-сасудзістых хвароб абвінавацілі тлушчы жывёльнага паходжання. І тое таксама было невыпадкова, бо калі вытворцы пачалі змяншаць колькасць жывёльных тлушчаў у прадуктах, яны сталі не такімі смачнымі. Каб іх палепшыць, пачалі дадаваць цукар.

Насамрэч, сёння складана вызначыць, колькі цукру мы ўжываем на працягу дня, і цалкам адмовіцца ад яго немагчыма, бо ён паўсюль — у каўбасе, сасісках, фастфудзе, соусах, паколькі паляпшае смакавыя якасці. У 1960-я гады вядомыя вучоныя са знакамітых лабараторый і ўніверсітэтаў заяўлялі, што цукар мінімальна ўплывае на здароўе чалавека. Ім удавалася 60 гадоў падманваць не толькі людзей, а нават асобныя дзяржавы, пакуль іх перапіскі з кампаніяй «Кока-Кола» не былі абнародаваны ў 1965 годзе ў газеце «Нью-Ёрк Таймс». Высветлілася, што ў той час кожны з іх атрымаў каля 50 тысяч долараў за тое, што друкавалі выгадную для цукровых кампаній інфармацыю. На цяперашнія грошы гэта каля паўмільёна долараў.

У той час вучоныя сцвярджалі, што няважна, што вы ясцё, важна, як вы рухаецеся і колькі калорый спальваеце. А якая ежа трапляе ў страўнік — кавалачак мяса ці кілаграм цукру — гэта не мае значэння. З табліц ужывання вугляводаў, бялкоў, тлушчаў нават выключылі нормы цукру. Высновы гэтых вучоных даходзілі да смешнага: дзеці, якія ядуць шакалад, худзейшыя, чым тыя, хто яго не есць.

***— Зноў жа, сёння такія маніпуляцыі куды больш складана рэалізаваць, калі мы маем шмат крыніц інфармацыі...***

— Кажучы пра ўплыў «Кока-Колы» на палітыку розных краін, нельга не сказаць пра Мексіку. Мексіканскі горад Сан-Крыстабаль-дэ-лас-Касас вядомы сусветным рэкордам ужывання гэтага напою. Штодзень жыхары выпіваюць тут у сярэднім па два літры колы. З-за гэтага назіраецца вялікая колькасць смерцяў за кошт цукровага дыябету і сардэчна-сасудзістых захворванняў.

У гэтым горадзе водаправодная вада насычана хлорам і піць яе літаральна немагчыма. Нягледзячы на вялікую колькасць насельніцтва, у горадзе прымітыўная каналізацыя, змесціва якой выліваецца ў раку, таму адтуль таксама немагчыма ўжываць ваду. У людзей застаецца тры варыянты: піць кока-колу, алкаголь ці набываць дарагую пітную ваду. Канешне, яны выбіраюць колу, бо літр гэтага напою танней, чым літр вады.

У гэтым жа горадзе знаходзіцца самы вялікі завод «Кока-Колы», які штодзень выпампоўвае з зямлі адзін мільён галонаў вады (1 галон = каля 4,5 літра). Калі ж чалавек захоча прабурыць калодзеж, мэрыя такога дазволу па прычыне засухі не дасць.

Трэба сказаць, што ў гэтым месцы жывуць карэнныя жыхары Амерыкі, індзейцы, і іх продкі не мелі ў рацыёне цукру і нават мёду. Яны нашмат больш адчувальныя да цукру і больш пакутуюць з-за ўжывання салодкіх напояў. Такім чынам, белыя людзі прынеслі мясцовым жыхарам не толькі венерычныя захворванні і вятранку, ад якой вялікая колькасць індзейцаў загінула.

Рэкламная кампанія «Кока-Колы» стартавала з 1968 года, калі Мексіка прымала Алімпіяду. Пасля было яшчэ шмат кампаній, адаптаваных для карэнных жыхароў Мексікі. І цяпер яны лічаць колу сябрам, лекарам, памочнікам у жыцці і напоем на ўсе выпадкі. Кока-колу пачалі выкарыстоўваць нават у рэлігійных і традыцыйных абрадах, ёй частуюць гасцей, і адмовіцца нельга, бо гэта знявага.



Зразумела, што ўсё гэта было б немагчыма без вялікай карупцыі, прычым на самым высокім узроўні. Вісэнтэ Фокс, які быў прэзідэнтам Мексікі з 2000 да 2006 года, з 1975 да 1979-га быў дырэктарам сеткі кампаніі «Кока-Кола» ў Лацінскай Амерыцы. Ён і сам не адмаўляў, што менавіта яна прапанавала яму пайсці ў палітыку.

**«У цукры няма ніводнай карыснай для здароўя ўласцівасці. Нашымі продкамі ён выкарыстоўваўся рэдка і не ўваходзіў у іх рацыён харчавання».**

Вядома, праблему мог бы вырашыць парламент Мексікі, дадаўшы падатак, каб кола стала даражэйшай і людзі яе менш пілі, бо калі называць сваімі імёнамі, — гэта генацыд індзейцаў. Але такі падатак ніколі не зможа набраць дастатковую колькасць галасоў у парламенце і відавочна, чаму большасць дэпутатаў галасуе за «Кока-Колу». Пры гэтым нават калі кола стане даражэйшай і людзі будуць набываць больш вады, для кампаніі гэта ніякай ролі не адыграе, бо самы вялікі завод па продажы вады ў Мексіцы таксама належыць «Кока-Коле». Таму Мексіку, дзе гіганцкая кампанія ўкаранілася ў сістэму ўпраўлення дзяржавай, называюць «краінай Кока-Кола». Гэта адна з самых вялікіх пагроз, калі вялікія карпарацыі дыктуюць уладзе, якую палітыку праводзіць, і гэта палітыка накіравана супраць нацыі, каб адзінкавыя людзі маглі тут зарабляць.

Дарэчы, Мексіка займае другое месца па вытворчасці Кока-колы пасля ЗША, на трэцім месцы — Нігерыя, якая забяспечвае гэтым напоем усю Афрыку. І ёсць дзве краіны, дзе колы няма: Куба і Паўночная Карэя.

***— Тут можна запярэчыць, што людзі свядома становяцца ахвярамі рэкламнай кампаніі і набываюць колу замест вады.***

— Тады прывяду іншы прыклад. Яшчэ адна падобная кампанія — шведская «Нестле», якую мы ведаем па кандытарскіх вырабах і дзіцячым харчаванні. «Нестле» была першай, хто вырабіў сухую малочную сумесь для дзіцячага харчавання. Спачатку яна прызначалася для мам, якія не мелі малака і не маглі карміць грудзямі.

Трэба сказаць, што аналага матулінага малака не існуе. Разам з ім дзіця атрымлівае не толькі ўсе пажыўныя рэчывы, але і імунітэт. Звычайна дзеці, якія не атрымалі мацярынскае малако, па жыцці маюць праблемы з імунітэтам.

Продажы малочных сумесяў у «Нестле» ішлі дрэнна, і кампанія вырашыла памяняць палітыку. Рэкламавалася, што дзіцячая сумесь «Нестле» нашмат лепш, чым мацярынскае малако. Пасля гэтага продажы выраслі амаль у сто разоў. Цынізм гэтай рэкламнай кампаніі нават не ў тым, што па ўласцівасцях сумесь і блізка не стаяла з матчыным малаком. У ёй утрымліваецца вялікая колькасць цукру, і мы падсаджваем дзіця на гэтае рэчыва, якое Сусветная арганізацыя аховы здароўя сёння адносіць да псіхатропаў. Злоўжыванне цукрам не толькі пагаршае здароўе ў дарослых, але і ўплывае на здароўе дзяцей.

Здавалася б, на гэтым этапе «Нестле», павялічыўшы продажы, павінна было супакоіцца, але яго апетыты не змяншаліся. У наступны раз кампанія заявіла, што мацярынскае малако шкоднае і трэба замяніць яго сумесямі. Гэта рэклама «Нестле» дагэтуль лічыцца адным з самых вялікіх падманаў XX стагоддзя.

Самыя вялікія продажы дзіцячых сумесяў «Нестле» былі ў Афрыцы. Аднак там вялікія праблемы з чыстай пітной вадой. «Нестле» замоўчвала той факт, што сумесь трэба разбаўляць чыстай вадой, — бо пачалі б падаць продажы. Трэба сказаць, што для гэтых мэт можна кіпяціць ваду. Але паколькі ў многіх афрыканскіх краінах нізкі ўзровень жыцця, недахоп

**«Сёння складана вызначыць, колькі цукру мы ўжываем на працягу дня, і цалкам адмовіцца ад яго немагчыма, бо ён паўсюль — у каўбасе, сасісках, фастфудзе, соусах, паколькі паляпшае смакавыя якасці».**

газы, людзі не маглі кіпяціць ваду. Таму тысячы дзяцей загінулі, бо маці разбаўлялі сумесь звычайнай некіпячонай вадой.

Калі ў 1980-х гадах прадстаўнікоў «Нестле» запрасілі ў Сенат ЗША, адзінае пытанне, якое ім адрасавалі, — ці можна прадаваць сумесь там, дзе няма чыстай вады. Кампанія «Нестле» адказала, што за гэта павінен адказваць распаўсюджвальнік у Афрыцы і ўсё напісана ў інструкцыі. Але інструкцыі на англійскай і французскай мове для непісьменнага насельніцтва афрыканскіх краін — проста малюнкі. Аднак гэта справа стала гучнай, і ў 1981 годзе Сусветная арганізацыя аховы здароўя забараніла любую рэкламу дзіцячай сумесі, дзе сцвярджаецца, што яна лепш за мацярынскае малако.

Але гэта не спыніла кампанію «Нестле». У тых краінах, дзе водаправодная вады мела прыдатную якасць, напрыклад у Пакістане, яе разлівалі і прадавалі ў бутэльках. Калі цыстэрна вады з водаправода ў Пакістане каштавала 10 долараў, то ў бутэльках — 50 тысяч долараў. Літаральна з нічога рабіліся грошы. Калі ў дырэктара кампаніі «Нестле» Пітэра Брабека ў 2012 годзе спыталі пра гэта, ён адказаў, што ў міжнародныя правы чалавека не ўваходзіць доступ да чыстай вады.

Нягледзячы на тое што СААЗ забараніла рэкламу дзіцячай сумесі, «Нестле» праз дактароў і бальніцы працягвала рэкламаваць сваю прадукцыю. Яе рэкамендавалі ўрачы, ці проста забяспечвалі ўсю дзіцячую бальніцу такой сумессю. Вядома, гэта немагчыма зрабіць без узгаднення на ўсіх узроўнях.

Палітыка зніжэння ўзроўню ведаў урачоў у краінах другога і трэцяга свету і змяншэнне іх заработнай платы ўваходзілі і ўваходзяць у планы гэтых карпарацый. Бо маладасведчаным урачом і ўрачом, які зарабляе няшмат, заўсёды лягчэй кіраваць і кантраляваць, чым высокакваліфікаваным доктарам з добрай зарплатай.

***— Які ж спосаб супрацьстаяць захадам такіх карпарацый?***

— Нягледзячы на ўсе меры, якія прымаюцца, колькасць ужывання цукру расце ў свеце на два працэнты ў год. У цяперашні час ніхто не можа растлумачыць, якая карысць ад пакарання дрэнных людзей на тым свеце, таму наша задача — клапаціцца пра нашых дзяцей і наступныя пакаленні, каб яны не трапілі ў пастку карыслівых вар'ятаў. Адзінае, што мы можам пакінуць пасля сябе і тое, чаго баяцца дзялкі ў гэтых карпарацыях, — адукаваная нацыя. Не столькі патрыятызм аб'ядноўвае людзей, колькі веды. З дапамогай добрай адукацыі мы можам захаваць наступнае пакаленне і нашу краіну. У невялікай Беларусі з дзевяцімільённым насельніцтвам гэта нескладана зрабіць.

**Алена КРАВЕЦ.**

# Чаму кітайцы называюць сябе «нашчадкамі дракона»?

## Распавёў «Звяздзе» Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол КНР у Беларусі Се Сяаюн

**«Сёння ў Кітаі наступіла Свята Вясны (Новы год па месяцавым календары) і пачаўся год Дракона. Па меры таго як Кітай працягвае ўсё больш адкрывацца свету, гэтае свята ўсё больш ператвараецца ў глабальную падзею, становіцца мостам сяброўскіх абменаў, які ў любым выпадку ў любым выпадку ў любым выпадку ў любым выпадку**



Фота БелТА.

### ПЯЦЬ РЭЛІКВІЙ

— Як пасла Кітая ў Беларусі маю ўвагу прыцягнулі некалькі цікавых падзей, звязаных са Святам Вясны, якія нядаўна адбыліся ў вашай краіне. Напярэдадні года Дракона дракончык-хамелеон Жорык, які жыве два з паловай гады ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, праславіўся ў розных беларускіх СМІ. Мінскі заапарк абраў «Дракона 2024 года» — ім стала яшчарка. Многія карыстальнікі інтэрнэту ў Беларусі размяшчалі ў сацыяльных сетках сваіх яшчарак, хамелеонаў і іншых гадаванцаў, якія звязаныя з драконам, — заўважыў Се Сяаюн. — Жыхары Мінска, Гродна, Брэста і іншых месцаў таксама дэманстравалі вырабы ручной працы па матывах кітайскіх драконаў. Усё гэта ў поўнай меры адлюстроўвае вялікую цікавасць беларускага народа да сімвала гэтага года і культуры, якая стаіць за ім.

У гісторыі Кітая выява дракона сыходзіць каранямі ў глыбокае мінулае, ён захаваны да драбнюткіх дэталяў у шматлікіх культурных рэліквіях і класічных творах. Яго з'яўленне можна прасачыць як мінімум да перыяду сярэдняга неаліту. «Дракон Лун Чэньчэнь» у якасці талісмана гала-канцэрта да Свята Вясны 2024 года ўвасабляе ў сабе элементы з пяці вядомых культурных рэліквій нацыянальнага ўзроўню. Трактат «Паходжанне кітайскіх іерогліфаў» дынастыі Хань называе дракона «правадыром істот, пакрытых луской» і апісвае яго асаблівасці: «У дзень вясновага раўнадзенства дракон узносіцца на нябёсы, а ў дзень восеньскага раўнадзенства апускаецца ў вір». У старажытнай кнізе «Эр'я» дынастыі Сун адзначаецца, што дракон падобны да дзевяці відаў жывёл, а менавіта: «У дракона рогі — як у аленя, галава — як у вярблюда, вочы — як у труса, шыя — як у змея, чэрава — як у вялікай вустрыцы, луска — як у рыбы, кіпцюры — як у арла, лапы — як у тыгра, а вушы — як у каровы». Акрамя таго, існуе мноства згадак пра драконаў у шматлікіх класічных кітайскіх творах, такіх як «Узвышэнне ў ранг духаў», «Сон у чырвоным цераме», «Падарожжа на Захад» і «Аповесць аб дзіўным з кабінета Ляа». Гэтыя культурныя рэліквіі і літаратурныя творы адлюстроўваюць канкрэтнае ўяўленне старажытных кітайскіх продкаў аб міфічным звяры і фіксуюць сістэмную спадчыну культуры дракона са старажытных часоў да нашых дзён.

### СПАДЧЫНА ХУАНДЗІ

— Як узнікла культура дракона ў Кітаі? Кажуць, што ў часы праўлення легендарнага імператара Хуандзі Сюаньюаня, прабацькі кітайскай нацыі, у свеце з'явіўся дракон і дапамог яму аб'яднаць кітайскія плямёны. Ён стварыў татэм дракона з целам змея, які ўбабраў у сябе характарыстыкі татэмаў іншых плямёнаў, Хуандзі сам стаў увасабленнем дракона. Гэтая версія актуальная і дагэтуль, таму кітайцы завуць сябе «нашчадкамі дракона». Іншая версія распавядае аб тым, што старажытныя продкі кітайцаў не маглі растлумачыць узнікненне такіх прыродных з'яў, як дажджы з навальніцамі, а дажджавая вада была надзвычай важная для земляробчага грамадства. Таму яны прыдумалі міфічную жывёлу — дракона (па-кітайску «лун»). Вымаўленне гэтага слова па-кітайску гучыць падобна грымотам — для таго, каб загадваць прыродай і рабіць надвор'е, якое спрыяе багатаму ўраджаю. У гэтым сэнсе дракона можна лічыць самым раннім талісманам Кітая, — падкрэсліў кіраўнік дыпмісіі. — Культура дракона здаўна глыбока інтэгравалася ў кітайскую культуру і стала адным з найбольш



рэпрэзентатыўных культурных і духоўных сімвалаў кітайскай нацыі. Дагэтуль кітайцы ўсё яшчэ выконваюць танец дракона падчас Нова года, удзельнічаюць у гонках на драконавых лодках падчас Свята Дуаньу, праводзяць фестывалі драконавых ліхтароў падчас Свята ліхтароў. Культура дракона ўсё яшчэ жыва прысутнічае ў побыце сучасных людзей.

### ПОСПЕХ І ДАБРАБЫТ

— Хоць сярод дванаццаці знакаў гараскопа толькі дракон не мае адпаведнага фізічнага аб'екта, але гэта не паўплывала на прыхільнасць людзей да яго, а наадварот, надала яму непаўторнай зачароўнасці. У працэсе доўгатэрміновага развіцця і эвалюцыі сімвалічнае значэнне паступова станавілася ўсё больш змястоўным, а яго выява — усё багацейшай. Дракон увесь час аказвае шырокі і працяглы ўплыў на жыццё людзей. У пэўнай ступені гэта адзін са знакаў гараскопа з найбагацейшай вобразнасцю і з самымі шматлікімі сімвалічнымі значэннямі.

Па-першае, ён сімвалізуе ўладу і пашану. Старажытныя кітайскія кіраўнікі называлі сябе «Сапраўдны дракон, Сын Неба» і выкарыстоўвалі дракона — «божага звера, які дасягае неба», каб паказаць свой аўтарытэт, высакароднасць і святасць. Трон імператара называўся «лун'і», што даслоўна азначае «драконаў трон», адзенне імператара — «лунпаа» («драконавая сукенка»).

Па-другое, дракон сімвалізуе адвагу і сілу. Паводле легенды, ён можа выклікаць вецер і дождж, кіраваць громам і маланкай, рассейваць цемру, ён адважны, майстэрскі ў баі і валодае невычэрпнай сілай. Таму старажытнае кітайскае войска выкарыстоўвала сцяг з выявай дракона як сімвал павышэння баявога духу.



— Сёння ў Кітаі ў назвах шэрагу важных навукова-тэхнічных дасягненняў ёсць імя дракона, — адзначыў Се Сяаюн. — Напрыклад, першы заселены глыбокападводны апарат уласнай распрацоўкі «Цзялун» («Водны дракон»), першы палярны навукова-даследчы ледакол айчыннай распрацоўкі і вытворчасці «Сюэлун-2» («Снежны дракон»), вялікі самалёт-амфібія «Куньлун» («Рыба-дракон») AG600. Гэта дэманструе цвёрдую ўпэўненасць Кітая ў самастойнасці і самаўдасканаленні ў навукова-тэхнічнай вобласці.

Па-трэцяе, дракон сімвалізуе мудрасць і загадкавасць. Паводле міфалогіі, ён можа прадказваць будучыню і бачыць душу чалавека. Такога роду мудрасць і таямнічы сімвалізм адлюстроўваюць разважанні і фантазіі старажытных кітайцаў аб невядомым свеце. Фразеалагізмы «дракон, які крадзецца, і птушаня фенікса», «тыгр, які крадзецца, і затоены дракон» выкарыстоўваюцца для апісання неардынарных людзей і герояў, якія валодаюць выдатнымі талентамі.

Па-чацвёртае, дракон сімвалізуе адзінства і гармонію. Яго знешні выгляд спалучае ў сабе характарыстыкі розных жывёл: рыбы, кракадзіла, змяі, свінні, каня і каровы — і часта суправаджаецца аблокамі, громам і маланкамі, вясёлкамі, тарнада і іншымі прыроднымі з'явамі. Такім чынам, гэтая выява ўвасабляе інтэграцыю і абмен паміж рознымі нацыямі і культурамі.

Па-пятае, дракон сімвалізуе шчаслівую прыкмету і росквіт. Ён лічыцца міфічным зверам, які прыносіць поспех і спрыяльныя прыметы, дажджы і багаты ўраджай, а таксама з'яўляецца сімвалам багацця. У народных вераваннях дракон лічыцца богам, які можа дабраславіць людзей, даўшы ім дабрабыт, здароўе і багацце. Таму людзі часта выкарыстоўваюць драконаў у якасці дэкаратыўных узораў па святах, каб прыцягнуць поспех і дабрабыт.

### УСХОД І ЗАХАД

— Цікава, што з-за адрозненняў у гісторыі і культуры ў Кітаі і іншых азіяцкіх краінах успрыманне дракона істотна адрозніваецца ад яго ўспрымання ў еўрапейскіх краінах. Датычна знешняга выгляду ў азіяцкіх драконаў звычайна змеепадобнае тулава, дапоўненае характарыстыкамі іншых жывёл, яны з аленевымі рагамі, без крылаў. Еўрапейскія драконы больш падобныя на дыназаўраў, звычайна яны могуць дыхаць агнём, без рагоў, з перапончатымі крыламі, як у кажаноў. Што да асяроддзя пасялення, азіяцкія драконы звычайна жывуць у безданях, горных раўчуках, рэках, азёрах і іншых месцах з вадой, а еўрапейскія драконы — у горных пячорах. З пункту гледжання сімвалічнага значэння, азіяцкія драконы — гэта спрыяльныя жывёлы, здольныя прыносіць шчасце і ўстараняць бедствы. Яны часта асацыюруюцца з радасцю і спакоем, росквітам і магутнасцю, жыццёвай сілай, дабрабытам і поспехам.

— Еўрапейскія драконы ў міфах, легендах, народных паданнях і рэлігійных трактатах часта з'яўляюцца пасланцамі дэмана ці захавальнікамі скарбаў. Яны адыгрываюць іншыя негатыўныя ролі, таму часта з'яўляюцца сімвалам прагнасці, зла, небяспекі і разбурэнняў. І азіяцкія, і еўрапейскія драконы ў пэўнай ступені адлюстроўваюць уяўленне старажытных людзей аб невядомых і суровых прыродных сілах, яны ўвасабляюць імкненне жыхароў Усходу і Захаду да дабра. Нягледзячы на вышэйзгаданыя шматлікія адрозненні, гэта зусім не ўплывае на прыхільнасць людзей да кітайскага дракона, — заўважыў кітайскі дыпламат. — Многія замежнікаў, у тым ліку беларусаў, усё больш прыцягвае кітайскі дракон і кітайская культура, якую ён прадстаўляе. Дракон дае адпраўны пункт у абменах усходняй і заходняй цывілізацый.

### ТОЛЬКІ ЎГОРУ

— У мінулы год Труса дзякуючы сумесным намаганням абодвух бакоў кітайска-беларускія адносіны зрабілі ўпэўнены крок наперад. Старшыня Сі Цзіньпін і Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка двойчы правялі сустрэчы, у ходзе якіх адбыўся глыбокі абмен думкамі па двухбаковых адносінах і супрацоўніцтве ў розных галінах. Таксама была апублікавана Сумесная заява Беларусі і Кітая аб далейшым развіцці адносін усепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства ў новую эпоху, задаўшы кірунак далейшага пашырэння двухбаковых адносін.

Я ўпэўнены, што ў год Дракона, дзякуючы асабістаму клопату і пад сумесным кіраўніцтвам лідараў дзвюх дзяржаў, кітайска-беларускія адносіны абавязкова будуць поўныя энергіі і жыццёвых сіл, працягнуць сваё бурнае развіццё, — перакананы Се Сяаюн, — а супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі ў розных галінах будзе абавязкова ўзнімацца ўгору, як дракон рушыць у неба, і дасягне выдатных вынікаў.

Падрыхтаваў
**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

### СВЯТА ВЯСНЫ — ПАЧАТАК НОВЫХ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сардэчна павіншаваў Старшыню Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпіна са Святам Вясны, з якім надыходзіць новы год па месяцавым календары, паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«Кітай іграе ўсё больш важную ролю ў забеспячэнні балансу, міру і справядлівасці на міжнароднай арэне, — падкрэсліваецца ў віншаванні. — Ваша краіна паспяхова ўвасабляе ў жыццё шматвекавыя парадыгмы і новыя стратэгічныя прыярытэты».

Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, заступніцтва Дракона традыцыйна абяцае найлепшыя часы для прыняцця мудрых, дальнабачных і смелых рашэнняў: «Надыходзячы год — 75-годдзе ўтварэння Кітайскай Народнай Рэспублікі — будзе адзначаны рэалізацыяй усеабдымнай мадэрнізацыі і значнымі пераўтварэннямі новай эпохі».

У віншаванні таксама адзначаецца, што мінулы год стаў важнай вяхой у паглыбленні ўсепагоднага і ўсебаковага стратэгічнага партнёрства Беларусі і Кітая. Мінск і Пекін выйшлі на яшчэ больш высокі ўзровень палітычнага даверу і каардынацыі міжнароднай дзейнасці, пашырылі маштабы шматвектарнага супрацоўніцтва.

«Упэўнены, што ў 2024 годзе мы ўзмоцнім тэхналагічную і інвестыцыйную кааперацыю, паспяхова правядзём Год супрацоўніцтва ў галіне тэхналогій і інавацый, узбагацім гуманітарнае ўзаемадзеянне, — адзначыў беларускі лідар у віншаванні. — Мы гатовы прапанаваць шэраг новых кірункаў у кантэксце станаўлення Беларусі як важнай інвестыцыйнай пляцоўкі КНР у рэгіёне».

Прэзідэнт таксама выказаў спадзяванні на працяг даверлівага і змястоўнага дыялогу са Старшынёй КНР для абмеркавання актуальных пытанняў глабальнага і двухбаковага парадку дня.

Будзем знаёмыя
*7. не позднее 30 календарных дней после разработки и согласования проектной документации на электроснабжение произвести электромонтажные и пусконаладочные работы с предоставлением пакета документов в ГУ «Государственный энергетический и газовый надзор» для получения разрешения на подключение электроустановок;*
*8. заключить договор на электроснабжение с УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минской дистанцией электроснабжения, копию договора предоставить УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский;*
*9. в течение 10 рабочих дней после заключения договора на электроснабжение с УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» Минской дистанцией электроснабжения, предоставить УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский его копию, а также копии технических условий и акта осмотра ГУ «Государственный энергетический и газовый надзор».*

**Государственное юридическое лицо** – УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский, г. Минск, пл. Привокзальная, 3, тел. (017) 225-52-62.

**Организатор торгов** – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 10, тел. (017) 360-42-22.

**Форма проведения торгов** – аукцион.

Торги проводятся в соответствии с Положением о порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».

Аукционные торги проводятся **22 марта 2024 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Карла Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Документы на участие в торгах принимаются с 12.02.2024 **по 18.03.2024** включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, к. 6.

Документы, поданные по истечении указанного срока, не рассматриваются. Ответственность за достоверность сведений, указанных в документах, представленных для участия в торгах, несут лица, их подавшие.

**Порядок оформления участия в торгах:** к участию в аукционных торгах допускаются лица, прошедшие заключительную регистрацию, которые в срок, установленный для приема документов на участие в аукционных торгах, внесли задаток (задатки) и заключили с организатором торгов соглашение установленной формы о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов по соответствующему их предмету (далее – соглашение), а также представили организатору торгов следующие документы:
- заявление на участие в торгах;
- заверенную банком копию платежного документа о внесении суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет организатора торгов (в случае участия в торгах в отношении нескольких предметов торгов задаток вносится по каждому из предметов торгов);
- копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в торгах;
- эскиз средства наружной рекламы, выполненный в цвете на бумажном носителе в формате А4 или электронном носителе (по местам 1-1, 1-2, 1-3, 1-4, 1-5).

Сумма задатка (сумма задатка соответствует начальной цене предмета торгов) должна быть внесена по соответствующему предмету торгов не позднее окончания срока и времени, установленных для приема документов, на расчетный счет организатора торгов BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, кодификатор назначения платежа 40901 (назначение платежа – задаток для участия 22.03.2024 в торгах на право размещения средств рекламы по предмету торгов №_).

Участнику, не ставшему победителем торгов (лицом, приравненным к победителю торгов), внесенный задаток (задатки) возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

При подаче организатору торгов документов для участия в торгах и заключении соглашения представляются:

физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Лицу, допущенному к участию в аукционных торгах, организатор торгов выдает билет участника торгов, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Перед началом торгов организатор торгов проводит заключительную регистрацию лиц, допущенных к участию в торгах. Заключительная регистрация представляет собой замену билетов участников торгов на аукционные номера, под которыми участники торгов будут участвовать в торгах. После проведения торгов участники обязаны вернуть эти номера организатору торгов.

**Порядок определения победителя торгов:** торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Не допускается продажа предмета торгов по начальной цене. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона, который определяется аукционистом в пределах от 5 до 15 процентов от предыдущей названной аукционистом цены. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. Если заявление на участие в торгах подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, а такой участник признается лицом, приравненным к победителю торгов.

**Иные условия торгов:**

Победитель торгов (приравненное к нему лицо) обязан:

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** возместить государственному предприятию «МГЦН» затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для их проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись;

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** перечислить на расчетный счет УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский сумму средств, за которую продан предмет торгов за вычетом внесенной суммы задатка (цена продажи предмета торгов – стоимость услуг УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский по размещению рекламы, определенная по итогам торгов и уплачиваемая ежемесячно в соответствии с условиями торгов и договором оказания услуг по размещению рекламы);

- **в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов** заключить договор оказания услуг по размещению рекламы с УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский (при условии внесения платы за предмет торгов и возмещения организатору торгов расходов на их организацию и проведение).

Размер штрафа, уплачиваемого участником торгов и (или) его победителем (приравненным к нему лицом) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет 99 (девяносто девять) базовых величин на дату проведения торгов.

**Телефоны для справок:**
отдел аукционов – (017) 360-42-22, УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский – (017) 225-52-62.

Извещение о проведении торгов размещено на сайтах: организатора торгов – **www.mgcn.by** (раздел «АУКЦИОНЫ/Рекламные конструкции»); УП «Минское отделение Белорусской железной дороги» станция Минск-Пассажирский – **www.pass.rw.by,** Минского городского исполнительного комитета – **www.minsk.gov.by** (раздел «Объявления – Аукционы»).

# РАДКІ, ШТО ПРАЦІНАЛІ СЭРЦА

## У Мінску адкрылася выстаўка памяці Аркадзя Куляшова

**«Перад сабой і светам будзь праўдзівы...» Такім паэтычным радком Аркадзя Куляшова названа літаратурна-дакументальная выстаўка да 110-годдзя паэта, якая адкрылася 7 лютага ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва. З гэтай нагоды прайшла вечарына з удзелам сваякоў паэта і даследчыкаў яго творчасці.**

Сярод слухачоў на вечарыне прысутнічалі вучні 40-й гімназіі горада Мінска, якія, як і ўсе беларускія школьнікі, вывучаюць у школе творчасць Куляшова, у тым ліку знакаміты верш «Бывай». **Дырэктар архіва-музея Алена МАКАРАНКА** нагадала, што, хоць гэты верш датаваны 1928 годам, тады і быў упершыню надрукаваны, але той варыянт, які мы ведаем, з'явіўся, калі паэт грунтоўна перапісаў твор ужо ў сталым узросце, пакінуўшы некранутымі пару радкоў. Слухачы атрымалі магчымасць параўнаць абодва варыянты верша, якія агучылі супрацоўнікі архіва.

— Самы знакаміты твор Аркадзя Куляшова на ваенную тэматыку — паэма «Сцяг брыгады», яе рукапіс захоўваецца ў нашым архіве, перададзены дачкой паэта Валянцінай. Гэта рэдкасць, таму што Куляшоў не захоўваў рукапісы. Як толькі твор быў гатовы, чарнавікі знішчаў, — распавяла Алена Макаранка. — Калі паглыбляешся ў вывучэнне дакументаў, адкрываеш шмат нечаканага. Напрыклад, аказалася, што Куляшоў цікавіўся касмічнай тэматыкай. Заўсёды даводзіў у спрэчках Максіму Танку і Пімену Панчанку, што жыццё на Марсе ёсць. Увогуле, быў вельмі шматпланавы... Пісаў артыкулы пра спорт, быў вельмі добрым шахматыстам і гульцом у гарадкі.

Шмат цікавага распавёў пра свайго дзядзьку пляменнік Аркадзя Куляшова Віталь Маслоўскі. Паэт любіў футбол, хадзіў на матчы, куды браў і малога пляменніка, зацята хварэў за «Спартак». Дзядзька браў Віталя і на рыбалку — меў уласную маторную лодку і цэлую калекцыю матораў.



А дзеці ў Саматэвічах вельмі чакалі прыезду сваяка са сталіцы, бо была магчымасць пакатацца на яго машыне.

Згадаў Віталь Іванавіч і пра Алесю Карыткіну, прататып Алесі з твораў паэта. Калісьці маці Віталя Маслоўскага напісала Карыткінай, у замужжы Белазоравай, ліст з паведамленнем, што Куляшоў памёр. Завязалася перапіска. Але гэтую перапіску Віталь Іванавіч знайшоў толькі нядаўна. Дзесяць лістоў былі надрукаваны ў студзеньскім часопісе «Полымя» гэтага года, а самі лісты, а ўсяго іх сямнаццаць, Віталь Маслоўскі пад канец вечарыны перадаў Беларускаму дзяржаўнаму архіву-музею літаратуры і мастацтва.

У Аркадзя Куляшова было сем унукаў. Старэйшы з іх, Уладзімір Бярбераў, таксама падзяліўся ўспамінамі. Сярод іншага — пра тое, што яго дзед расказваў пра падзеі, апісаныя ў паэме «Сцяг брыгады». Менавіта пабачанае ў час, калі паэт з сябрамі выбіраўся пад бамбёжкамі з Беларусі, прывялі да першага інфаркту, пра які ніхто не ведаў. А тады, уражаны адным жахлівым відовішчам, Куляшоў упаў з прыступам, і сябры тры дні яго неслі. Потым пайшоў сам, так і перанёс на нагах. Дабраліся да Оршы, дзе нарэшце знайшлі ваенкамат, адкуль атрымалі накіраванні на фронт.

— Дзед цікавіўся абсалютна ўсім. Акрамя побыту — вось побыт яго крышачку раздражняў. У шахматы нават першаразраднікі яму прайгравалі. У хаце быў маўклівы, увесь у сваіх думках. Мог ляжаць на канапе і глядзець у столь гадзінамі. Пасля падымаўся і



з хуткасцю сакратаркі-машыністкі пачынаў друкаваць — складаў цэлыя раздзелы паэмы ў галаве і запісваў, пакуль не забыўся. Ніколі не рваўся ў прэзідыум, на трыбуну. Лічыў, што чалавек павінен быць сціплым.

Вядомая даследчыца Тэрэза Голуб, аўтар летапісу жыцця і творчасці Аркадзя Куляшова, распавяла, як працавала з сямейным архівам Аркадзя Куляшова, які перадалі сваякі паэта. Выказала і думку, якую падтрымалі ўсе: неабходна выдаць збор твораў народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова з навуковымі каментарыямі, які, як ні прыкра, дасюль не з'явіўся. Літаратуразнаўца Міхась Кенька расказаў пра Куляшова-перакладчыка, як пільна той працаваў над словам — падрабязнасці паэт сам маладому дысертанту распавёў.

На вечарыне прысутнічаў і народны мастак Беларусі Іван Якімавіч Міско, які таксама падзяліўся ўспамінамі:

— З Аркадзем Куляшовым я пазнаёміўся ў мастацкім музеі, ён заўсёды прыходзіў на выставы. Тады па маладосці я не наважваўся падысці, схапіць яго за руку: пайшлі ў майстэрню, ляпіць буду... Таму, працуючы над яго помнікам, мемарыяльнай дошкай, даводзілася працаваць па ўспамінах, па фота.

Іван Якімавіч падзяліўся ідэяй: на Нарачы, дзе знаходзіліся лецішчы некалькіх славутых пісьменнікаў, у тым ліку Аркадзя Куляшова, зрабіць мемарыяльны комплекс. На лаўцы сядзяць Аркадзь Куляшоў, Максім Танк і Міхась Лынькоў, якія не раз бавілі разам час у Нарачанскім краі. Гэта быў бы выдатны турыстычны аб'ект.

— Чаму б не абвясціць творчы конкурс на помнік гэтым волатам? — прапанаваў Іван Якімавіч.

На выстаўцы прадстаўлена шмат унікальных дакументаў, напрыклад, лісты аднакласнікаў Куляшова, якія жылі ў той «камуне восем і адна», якую ён апісвае ў сваёй паэме «Далёка да акіяна», — юны Аркадзь, які застаўся адзін у бацькоўскай хаце, запрасіў жыць да сябе аднагодкаў. Для архівістаў тут ёсць і загадка — у адным з лістоў гаворыцца, што Куляшоў «спаў у калясцы дзеда» і раніцай будзіў іншых «камунараў» на зарадку, падкотваючы да ложкаў у гэтай калясцы. Што гэта за каляска? Пакуль не высветлілі дакладна. Прадстаўлены і мсціслаўскі перыяд Куляшова, калі ён вучыўся ў педтэхнікуме, шмат дакументаў пра сяброў паэта, Юлія Таўбіна і Змітрака Астапенку, якія былі рэпрэсіраваны і пра якіх ён да канца жыцця ўспамінаў са скрухай, прысвяціў ім паэму «Маналог». Можна пабачыць і перапіску Куляшова ваеннага часу — з калегамі, са сваякамі: Куляшоў доўга не ведаў пра лёс сваёй сям'і, шукаў родных. Прадстаўлены і дакументы, якія расказваюць пра пасляваеннае жыццё паэта, ушанаванне яго памяці.

Наведаць выстаўку можна ў чытальнай зале архіва-музея.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

# ВЕРНІСАЖ ЯГО ВУЧНЯЎ

## Спадчына Міхаіла Савіцкага — не толькі ў карцінах




**МНОГІЯ ведаюць Міхаіла Савіцкага як вялікага беларускага мастака, але мала хто задумваецца пра тое, што ён быў яшчэ і таленавітым выкладчыкам. У 1981 годзе па яго ініцыятыве ў Мінску былі адкрыты Творчыя майстэрні жывапісу і скульптуры па адрасе Някрасава, 3. Мастацтва працягвае жыць у гэтых сценах і дагэтуль.**

Так, да дня нараджэння Міхаіла Савіцкага Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў запусціў унікальную выставу-прэзентацыю «Творчыя майстэрні — спадчына Міхаіла Савіцкага», дзе сабраны творы вучняў з тых самых майстэрань. Дарэчы, гэтыя работы раней не выстаўляліся.

Па словах **намесніка дырэктара па творчай працы НЦСМ Алесі ІНАЗЕМЦАВАЙ**, выстава — адпраўны пункт, якая вяртае гледача да гісторыі гэтага будынка і да гісторыі беларускага мастацтва ў цэлым.

— Гэта ўнікальны праект, дзякуючы якому маладыя мастакі былі ў той час падтрыманы дзяржавай, — распавядае яна. — Тут былі створаны ідэальныя ўмовы, і аб гэтым успамінаюць усе, хто праходзіў тут у свой час стажыроўку.

Сюды прыходзілі мастакі, якія скончылі тэатральна-мастацкі інстытут, які пасля стаў Акадэміяй мастацтваў, і атрымлівалі ў творчых майстэрнях «шліфоўку» свайго таленту. Усе мастакі-пачаткоўцы працавалі непасрэдна з самім Міхаілам Савіцкім. Але гэта было не стандартнае выкладанне.

— Гэта была праца пад патранажам. Ён дамагаўся ад мастакоў кампазіцыйнай цэласнасці, нейкай яскравай ідэі, выразных сродкаў, каб талент станавіўся больш ідэйна вывераны і мастацка прафесійны, — тлумачыць Алеся Іназемцава.

Непасрэдна на самой выставе-прэзентацыі ў большасці сваёй прадстаўлены выніковыя работы мастакоў, якія прымаў



у тым ліку і сам Міхаіл Савіцкі. Па ўспамінах вучняў, з аднаго боку, ён быў вельмі лаяльным да працэсу стажыроўкі: яму ўсё адно было, колькі часу ты праводзіш у майстэрнях, але з іншага боку, калі справа даходзіла да выніковай працы, ён быў максімальна строгі і справядлівы. Не баяўся крытыкаваць і прымушаў перапісваць карціны. Часам мастакі, каб дабіцца яго адабрэння, перараблялі ўсё па 10—15 разоў!

Міхаіл Савіцкі ствараў майстэрні для таго, каб развіваць беларускую рэалістычную жывапісную школу, захоўваць тыя традыцыі, якія былі напрацаваны ў гэтай школе, і перадаваць іх маладому пакаленню. Дарэчы, адна з выставачных работ, «Смерць Ілюшачкі» Алы Няхайчык, вельмі моцна нагадвае стыль самога Савіцкага. Адметна і тое, што на зваротным баку карціны ёсць невялікае пасланне: «З падзякай, майму настаўніку», што яшчэ больш падкрэслівае сувязь з яго мастацкай традыцыяй. Уражвае рэалізмам і сюжэтнасцю таксама работа «Благаслаўленне маладых» Сяргея Шэмета. Прапісаны драбнюткія дэталі таго часу, ажно да цыраты на стале. А яшчэ закранута тэма пераемнасці пакаленняў і кругавароту жыцця: на лаўцы сядзяць бабуля з дзядулем, маладых благаслаўляюць бацькі, якія таксама на сваім вяку пабачылі нямала, а каля ўслончыка стаіць хлопчык-падлетак, у якога ўсё гэта яшчэ наперадзе.



Выстава сапраўды ўнікальная, і час яе працы абмежаваны. Наведаць экспазіцыю можна да 18 лютага.

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

*Аляксандр Быкаў — ураджэнец Барысава, скончыў факультэт журналістыкі БДУ. Працаваў карэспандэнтам у шматтыражцы завода «БАТЭ», у Мядзельскай раённай газеце «Нарачанская зара». Аўтар зборнікаў вершаў «Кветка папараць», «Пад небам буслiным», «Барысаўскі тракт» і іншых, кнігі гумару «Пегас на сотках», кнігі прозы «Бабуліны макі».*

*Для Аляксандра Быкава як аўтара прозы не бывае лёсаў, няварты ўвагі: аднолькава цікавыя яму і вясковая бабуля Ніна, якая страціла пасля распаду СССР усе свае зберажэнні, і малады інжынер Сяргей Найдзін, што ў познесавецкія часы прыехаў працаваць у глыбінку, але не знайшоў там блізкіх па духу людзей. ГероЯў нібыта бачыш перад сабой. Бадай, у кожнага ёсць падобныя знаёмыя, суседзі, аднавяскоўцы. Дзякуючы назіральнасці аўтара, якая не дае згубіцца ніводнай дэталі паўсядзённага жыцця, два кароткія апавяданні Аляксандра Быкава малююць нядаўнія часы з пераканаўчай дакладнасцю.*

**Алена БРАВА.**

# ЖАЛЕЗНАЯ БАБА

Такіх спраўных кароў, як у яе, не было, бадай, ні ў каго ў раёне. Не кажучы ўжо пра калгасных. Выглядалі буйнейшымі за быка, бакі ў іх аж бліскачэлі. Яна іх не пасвіла: летам карміліся на чужых сенажацях ды агародах, а ўзімку сенам, накрадзеным гаспадыняй з чужых стагоў і калгасных рулонаў, кінутых там-сям у полі. Да таго ж, гэтыя каровы ніколі не цяліліся, раслі ялаўкамі, вось і таўсцелі.

Імя жанчыны было Ніна, але ва ўсёй акрузе ўжо з дзясятак ці больш гадоў звалі яе Жалезная Баба. Сакрэт гэтай мянушкі просты. Ніна мела незвычайнае хобі — штодня цягала ў сваю хату, што месцілася на хутары за некалькі кіламетраў ад горада, рознае ламачча. Летам грузіла на кольцы ад дзіцячай калляскі, зімой — на санкі і цягнула ўздоўж імклівай шашы.

— Ну, нашто табе гэта здалося? — пыталіся зрэдку ў жанчыны знаёмыя, але яна толькі махала ў адказ рукой і моўчкі рухалася далей.

Апраналася Жалезная Баба як бадзяга, спала на панцырным, яшчэ, мусіць, пасляваенных часоў ложку, на зрудзелым матрацы. У хаце не было падлогі, печ моцна дыміла, гаспадыня яе практычна не паліла. Ды і не было чым. Закручвалася ў халады ў свае рызманы і накрывалася падраным коўдрай. Хаця, як многія ведалі, мела Ніна ў горадзе аднапакаёвую кватэру, а на ашчаднай кніжцы — немалыя па тым часе грошы.

— Дзеля чаго табе гэтыя рублі, калі, акрамя батона ды кавалка каўбасы, нічога сабе не дазваляеш?! — кпілі з яе.

Жалезная Баба зноў жа толькі махала ў адказ рукой. Здаецца, былі ў яе недзе ў свеце сваякі, толькі жанчына ніколі пра іх не расказвала. І ўвогуле ні з кім не дзялілася сваімі думкамі.

Але раней было па-іншаму. Старажылы ўспаміналі, што працавала колісь Ніна бухгалтарам у раённым камбінаце бытавога абслугоўвання. Была прыгожай, годнай дзяўчынай і ад кавалераў не мела адбою. Толькі чамусьці так і засталася незамужняй.

Працавала старанна, мела пашану. І кватэру атрымала замест знесенай бацькоўскай хаты. Ды з цягам часу зрушылася нешта ў яе галаве. Хто кажа, што праз гэту самую бухгалтэрыю, хто спасылаецца на няўдалае асабістае жыццё. Дапрацаваўшы да пенсіі, кінула гарадскую кватэру з усёй маёмасцю, пасялілася на закінутым хутары. Ніхто не цікавіўся яе лёсам, і адзінай роднай душой быў звычайны дваровы сабака, якога яна, не шкадуючы грошай, рэгулярна карміла ліvернай каўбасой проста на ганку крамы.

Нашумелая гарбачоўская «перабудова» з яе няўцямным для многіх «цвярозым ладам жыцця» неўзабаве завяршылася прымітыўным, няўдалым путчам, пасля якога ў хуткім часе распалася на асобныя дзяржавы і вялікая краіна. Былыя каштоўнасці і лозунгі сталі раптоўна неактуальныя. Як сталі нічога не вартыя і тыя грошы, што ляжалі на рахунках гэтай жанчыны: ператварыліся ў звычайныя паперкі. Толькі цяпер міма Жалезнай Бабы замест «жыгулёў» і «масквічоў» усё часцей праляталі бліскучыя іншамаркі — бы з іншага вымярэння.

А яна па-ранейшаму — і ў снег, і ў дождж — упарта цягнула па абочыне свой «скарб». Аднойчы патрапіла пад колы аўто — кіроўца не заўважыў яе ў восеньскай цемрадзі. Але выжыла, хаця і доўга зрасталіся старыя косці. І занятку свайго не кінула. Толькі хада стала больш марудная: не дазваляла траўмаваная нага.

Аднойчы завіталі да Жалезнай Бабы ветэрынары з раёна і паставілі ўльтыматум: «Дастала ты ўжо ўсіх, старая! Людзі закідалі нас скаргамі. Карацей, трэба, каб здала сваіх «быкоў» на мяса. Грошы выплацім адразу, не хвалюйся».

Жалезная Баба, якая раней на такія прэтэнзіі проста не рэагавала, нечакана пагадзілася і толькі ціха папрасіла:

— Трэба дык трэба, забірайце кароў. Вось толькі, дзеткі, я жывёлу з хлява не павяду. Самі ўжо неяк...

Як выводзілі рагуль, Ніна таксама не глядзела. Але не магла не чуць, як тыя зацята раўлі, прадчуваючы свой незайздросны лёс. Адна з кароў, калі яе цягнулі, каб пагрузіць у кузаў аўтамашыны, зваліласся мёртвая тут жа на зямлю — не вытрымала, пэўна, ад стрэсу сэрца ў жывёліны.

Неўзабаве памерла і сама Ніна. Калі нябожчыцу падымалі з ложка, з-пад падушкі бязгучна выслізнулі тры ашчадныя кніжкі на яе імя...

**Аляксандр БЫКАЎ**

# АЎТОБУС З ПРЫГОЖАГА ЖЫЦЦЯ

Самавіты «Ікарус», бессаромна пыхнуўшы чорным з'едлівым дымам, прыпыніўся на ўскраіне гарадскога пасёлка. Выйшлі з яго двое: хлопец і дзяўчына, і запыталіся ў першага сустрэчнага, як прайсці да мэты іх падарожжа.

— Сюды вось, налева, збочце і якраз патрапіце, — ахвотна падказаў мужчына сталага ўзросту ў спецвопратцы пажарнага.

Сцежка павяла ўгору, і там, на мяжы, што аддзяляла пасёлак ад пустэчы, Сяргей і Тамара ўгледзелі будынак з патрэбнай шыльдай. Па ўсім было бачна, што пабудаваны ён даўно і пераежыў шмат гаспадароў.

Дырэктар Аляксандр Кандратавіч Сашын сустрэў гасцей ветліва, як сустракаў і папярэдніх маладых спецыялістаў. Кіраваў ён тут ужо дзве пяцігодкі і ніколі не быў асабліва рады новым работнікам. Сашыну цяжка было дагадзіць. Ён на поўным сур'ёзе лічыў, што можа справіцца на службе, калі што, і ўдвах з прыбіральшчыцай. Астатнія ж — проста лайдакі, здатныя толькі распісацца ў грашовай ведамасці. Гэтым разам кадравая праблема была даволі сур'ёзнай, бо не надта хто са спецыялістаў спяшаўся на перыферыю. Абставіны патрабавалі ад Сашына як кіраўніка пэўных захадаў. І зараз ён, пазіраючы крадком раз-пораз у акно, пакутліва думаў, што рабіць з маладым інжынерам Сяргеем Найдзіным: прымаць на працу ці не? Ад нялёгкіх развагжанняў, усярэдзіне нешта балюча торгалася, Кандратавіч моршчыўся, як ад зубнога болю, твар яго на нейкае імгненне рабіўся спалохана-бездапаможным.

— Ну вось, такая справа, — нарэшце выцісну ён. — Прыходзьце, калі ёсць жаданне. Працаваць у нас можна.

— А як усё ж з кватэрай? — нерашуча запытаўся Сяргей, якога жонка ўжо даўно непрыкметна штурхала ў бок.

— З жыллём увогуле цяжкавата, я і сам доўгі час па чужых кутках аціраўся. Дапаможам, канешне, але гады са два давядзецца пачакаць.

Сказаўшы гэта, Сашын зноў кінуў позірк у акно. Там пажарныя без асаблівага імпэту разгортвалі на жніўеньскай траве свае шлангі, падобныя на таўшчэзных вугроў. «Ну і лайдакі!» — звыкла падумаў ён, а ўслых прамовіў:

— А цяпер, калі маеце час, можаце прайсціся і азнаёміцца крыху з нашым пасёлкам.

І ветліва праводзіў маладую пару да дзвярэй кабінета.

Развітаўшыся, яны ўжо праз дзве хвіліны апынуліся на галоўнай вуліцы райцэнтра і паволі рушылі наперад. Вуліца неўзабаве закончылася невялікай плошчай, дзе месціся ўнівермаг, вузел сувязі, будынак гарсавета, а яшчэ Дом культуры. Крыху далей быў «Гастраном», на паліцах якога ляжалі мяса і каўбасы, хоць і па цэнах каапературнага гандлю.

— Мо хопіць, астатняе дагледзім іншым разам, а то на аўтобус спознімся, — прапанавала Тамара, і яны паспяшаліся на аўтавакзал. Не ведалі тады Сяргей і Тамара: тое, што яны паспелі агледзець, і быў, па сутнасці, увесь Пяцізёрск. На зваротным шляху яны так і не сказалі адзін аднаму нічога наконт канкрэтнага рашэння, але кожны паасобку ведаў: прыедуць сюды жыць і працаваць.

Зрэшты, арганізацыя нічым не адрознівалася ад іншых, хоць і была спецыфічнай. Панавала штодзённая мітусня, дырэктар не прымаў ні жывога слова, ні самастойнай думкі. Адзіным, хто не зусім упісваўся ў складзены гадамі шаблон, быў Эдзік Галубовіч. Ён меў пэўны інжынерны талент і рабіў сваю справу хоць і няспешна, але дасканала. Сталы Сяргея Найдзіна і Эдзіка стаялі насупраць адзін аднаго. Аднойчы будзённым сонечным днём, калі спякота асабліва даняла і зусім нічога не хацелася рабіць, Эдзік прамовіў:

— Зірні хутчэй у акно, вунь едзе аўтобус з прыгожага жыцця. — І паказаў на «Ікарус». — Калісьці я жыў у сталіцы і працаваў не абы-дзе, а ў Акадэміі навук! Там нават у прыбіральні такая чысціня, што і ў пакоях не заўсёды бывае.

— Чаму ж ты драпануў ад такой прыгажосці?

— Не было дзе жыць, як і табе. Толькі не вер моцна абяцанкам. Праўда, я хоць аднапакаёўкі дабіўся. Цяпер думаю, што рабіць далей. Абрыдла мне тут, нягледзячы на цудоўную прыроду. Ды і калег ніякіх здольнасцяў. Дыпломы, пэўна, за рыбу набылі, а колькі форсу!

Сяргей у нечым быў згодзен з такімі высновамі, але ўсё ж яму не падабалася, як пагардліва ставіўся Эдзік да сваіх таварышаў па працы.

У кабінеце зазваніў тэлефон. Галубовіча патурбавала сястра, якая па рабоце часта бывала за мяжой.

— Як з'ездзіла, Света? Прыдбала сёе-тое? Ну і добра. Фірма ёсць фірма. За цацкі для майго хлапчука вялікі дзякуй! Ён жа на нашы і глядзець не хоча, малы, а разбіраецца. Тэрмас, што ты з Балгарыі прывезла, я прадаў, нашто нам два? А калготкі аўстрыйскія абавязкова дашлі, і начную кашулю таксама. Мая жонка айчынныя насіць не можа...

Тэлефонная размова працягвалася, але Найдзін больш не слухаў. Яго мала цікавіла ўсё гэта. Раптам прыгадаў, што ўжо даўно не чытаў добрых вершаў ды ўласныя паэтычныя спробы закінуў. Быццам зламаўся жыццёвы стрыжань. Новае асяроддзе было не тое што чужым, а быццам з іншага вымярэння, да якога немагчыма прыстасавацца, нешта перайначыць.

З Сашыным Сяргей не сышоўся ні характарам, ні поглядамі. Да таго ж дырэктар быў увесь аддадзены рабоце, заседжваўся ў кабінеце дапазна, прыхопліваў і выхадныя, хоць асаблівай патрэбы ў гэтым не было. Нельга сказаць, што ён рабіў нешта надта карыснае ў пазаўрочныя гадзіны. Маляваў шматлікія табліцы і графікі, ладзіў стэнды. Што, на думку шэфа, павінна было скіраваць падначаленых на эфектыўную працу: быць, як кажуць, на ўзроўні патрабаванняў.

Сашын здзіўляў сваёй працавітасцю і за межамі канторы. Выехалі неяк у калгас ратаваць лён. Сумленна папрацавалі амаль да абеда, і тут нечакана пайшоў дождж. Прыселі на ўскрайку поля, распалілі вогнішча, каб перакусіць і сагрэцца. І толькі дырэктар працягваў у адзіноце драць той лён. Падышоў пасля доўгіх угавораў да імправізаванага стала і найперш з дакорам сказаў:

— Не зарабілі мы яшчэ на абед, трэба было папрацаваць трохі.

У Аляксандра Кандратавіча была таямніца, якую ён нёс па жыцці як цяжкі крыж. Ён баяўся людзей. Нават калі хто шчыра вітаўся ці звяртаўся з пытаннем, Сашын скалянаўся ўсім нутром, як спуджаны конь, насцярожана ўзіраўся ў твар. Так, пэўна, першабытны чалавек глядзеў бы на нашага сучасніка, не ведаючы, чаго ад яго чакаць. Гэты незразумелы страх штодзённа варочаўся ў сутарэннях душы Сашына. А яшчэ ў яго была непрыхаваная гатоўнасць выканаць любое ўказанне ці просьбу вышэйшага кіраўніцтва. Нават слова, кінутае чыноўнікам незнарок, лічыў за загад. А вось у калектыве заўсёды імкнуўся, каб выходзіла па-ягонаму. «Можа, так будзе не лепш, але і не горш», — не раз даказваў сваю спрэчную пазіцыю Найдзіну. А калі наступіла ўсім вядомая «перабудова», з такім жа імпэтам падхапіў ідэі, з якімі яшчэ ўчора рашуча змагаўся.

Галубовіч нарэшце закончыў сваю працяглую размову з сястрой. Пачаў нешта чарціць на лісце ватману, але спыніўся.

— Паслухай, Сяргей. У мяне выпадкова засталіся фінскія шпалеры, мо возьмеш?

— Дзякуй, не трэба. Мне і звычайныя падыдуць, абы было дзе іх клеіць.

— Цікавы ты чалавек, нават імпарт цябе не вабіць, — вынес свае рэзюмэ Эдзік і рашуча ўзяўся за аловак.

Прайшоў час, Сяргей ехаў у чарговы адпачынак на сваю малую радзіму. Камфартабельны аўтобус імчаў яго па звілістай шашы ў напрамку сталіцы, дзе трэба было яшчэ перасесці на знаёмую электрычку. З дзяцінства родны горад, даволі значны па памерах, запомніўся яму чамусьці ціхім і нейкім недагледжаным. І толькі царква ў старой яго частцы выдзялялася сваімі бліскучымі купаламі, быццам кідаючы выклік шэраму падабенству сапраўднага жыцця. А за рэчкай распластаўся шырокі выган, праз які пралягала некалі гразкая і ўлетку сцяжынка — туды, на самы ўскраек горада, дзе праходзіла яго бестурботнае дзяцінства.

Жыццё, як ні круці, паступова змяняецца, бы той выган пад націскам гарадскіх гмахаў. З вагоннага дынаміка пачуўся хрыплаваты голас машыніста электрычкі: «Наступная станцыя...»

Вось ён і прыехаў. А можа, і не з'язджаў нікуды? Проста ў чарговы раз вяртаецца з доўгай камандзіроўкі, адкуль, акрамя збалелай, адзінокай душы, нічога больш не вязе...

## Брестский филиал
## РУП «Институт недвижимости и оценки»
# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Лот № 1:**

**1)** Кап. строение с инв. № 100/С-61178 (наименование: корпус № 1; назначение: здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения)), площадью 14582,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 202М, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001034070 площадью 1,2881 га;
**2)** Передаточное устройство: кап. строение с инв. № 100/С-101268 (наименование: хозфекальная канализация; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 136,1 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, 291, канализационная сеть;
**3)** Передаточное устройство: кап. строение с инв. № 100/С-101270 (наименование: канализационная дождевая сеть; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 83,5 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, 289, канализационная сеть;
**4)** Передаточное устройство: кап. строение с инв. № 100/С-101263 (наименование: питьевой водопровод; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 301,3 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, 298, водопроводная сеть;
**5)** Передаточное устройство: капстроение с инв. № 100/С-101269 (наименование: канализационная дождевая сеть; назначение: сооружение специализированное коммунального хозяйства) протяженностью 59,3 м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, 288, канализационная сеть;
**6)** Трансформатор ТМЗ-1000/6/0,4 кВт, год выпуска 1974 г.;
**7)** Шкаф ШО;
**8)** КСО-266 камера распредилит. устройств 10 кВ, год выпуска 1971 г., инвентарный номер 81224;
**9)** Кабельная линия РП 159-ТП 3,6кВ, АСБ 3*95 L=400 м, инвентарный номер 28.11;
**10)** Трансформатор ТМЗ-1000/6/0,4 кВт, год выпуска 1969 г.;
**11**) Шкаф ШН-2, 4 шт.;
**12)** КСО-266 камера распредилит. устройств 10 кВ, год выпуска 1971 г., инвентарный номер 81235;
**13)** Кабельная линия РП 159-КТП 4,6кВ, АСБ 3*95 L=420 м, инвентарный номер 28.12;
**14)** КР93.00.000 кран подвесной электрический, г/п 2 т, инвентарный номер 154884;
**15)** Кран подвесной электрический г/с 2 тс, инвентарный номер 791015;
**16)** Кран подвесной электрический г/с 2 тс, инвентарный номер 791010;
**17)** Кран подвесной электрический г/с 2 тс, инвентарный номер 791009;
**18)** КР93.00.000 кран подвесной электрический 2/П2Т, инвентарный номер 791001;
**19)** Кран-балка подвесная г/п 1,0 т, инвентарный номер 791007;
**20)** Кран-балка подвесная г/п 1,0 т, инвентарный номер 791006;
**21)** Р2-БМ-1307 стеллаж механизированный б/трансманипулятора оргоснастка, инвентарный номер 154345;
**22)** Таль электрическая CD1/6, г/п 1 т, инвентарный номер 793118;
**23)** ВО92М электротельфер, инвентарный номер 793048;
**24)** Р2-НО-49 кран балочный, г/п 3,2 т, инвентарный номер 153152;
**25)** ТС-15 кран-штабелер, инвентарный номер 154353;
**26)** ТС-15 кран-штабелер, инвентарный номер 154352;
**27)** Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инвентарный номер 135021;
**28)** Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инвентарный номер 135020;
**29)** Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инвентарный номер 135019;
**30)** Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инвентарный номер 135018;
**31)** Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инвентарный номер 135017;
**32)** Р2-БМ-842 склад элеваторного типа, инвентарный номер 135016;
**33)** Кап. строение с инв. № 100/С-55259 (наименование: переходная галерея; назначение: здание административно-хозяйственное), площадью 146,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Московская, 202Б/5, на земельном участке с кадастровым номером 140100000001005815 площадью 7,9791 га

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 5 153 562,32 | Размер задатка, руб. | 515 356,23 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «БЭМЗ», 224020, г. Брест, ул. Московская, 202, тел./факс 80162340004. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Назначение платежа:** задаток за участие в аукционе по продаже объекта ОАО «БЭМЗ». **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 30 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия продажи:** без условий. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. Цена продажи объекта определяется с учетом НДС (20 %). **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Обременения:** наличие действующих договоров аренды

**Аукцион состоится 14 марта 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 13 марта 2024 г. до 17.00**

---

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

**Государственным предприятием**
## «БелЮрОбеспечение» (192821149)
**назначено проведение электронных торгов:**

| | |
|---|---|
| Организатор: | Филиал № 5 «Гродненский КСМ» ОАО «Красносельскстройматериалы» |
| Предмет | Лот № 9.2024.02.00022 клуб-столовая площадью 2328,1 кв. м |
| Место нахождения | г. Гродно, ул. Санаторная, 5Б |
| Начальная стоимость | 1 344 958,00 белорусских рублей с НДС |

**Торги будут проведены 27.02.2024 с 9.00 до 18.00 на ЭТП e-auction.by.**

Задаток в размере 10 процентов от стоимости лота должен быть зачислен после аккредитации (верификации) заявителя на ЭТП в срок до 16.00 26.02.2024.
Подробная информация размещена на сайте e-auction.by в разделе «Аукционы».

---

# ИЗВЕЩЕНИЕ
# О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: (0212) 24-63-12, (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебскоблресурсы», 210034, Витебская обл., г. Витебск, ул. Ленинградская, 193А, тел.: (0212) 65-71-98, (0212) 65-71-70.

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 200/С-49507 площадью 116,5 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное здание и магазин, назначение – здание многофункциональное.

Кап. строение с инв. № 200/С-49508 площадью 31,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – проходная, назначение – здание неустановленного назначения. Кап. строение с инв. № 200/С-49509 площадью 91,1 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – административное, назначение – здание административно-хозяйственное, составные части и принадлежности: тамбур. Кап. строение с инв. № 200/С-49510 площадью 116,2 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – гараж и бытовка, назначение – здание специализированное автомобильного транспорта. Кап. строение с инв. № 200/С-49511 площадью 280,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка. Кап. строение с инв. № 200/С-49512 площадью 2120,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – материальный склад № 1, 4, 6, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: рампа, навес, отдельная рампа, рампа. Кап. строение с инв. № 200/С-49513 площадью 1131,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, наименование – склад № 2, 3, 5, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, составные части и принадлежности: пристройка, рампа, навес.

Кап. строение с инв. № 200/С-59958 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 389,30 м, наименование – тепловая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 200/С-106672 площадью 6470,0 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, благоустройство территории, наименование – благоустройство территории, назначение – сооружение многофункциональное, составные части и принадлежности: проезжая часть, пешеходная часть, ограждение, трое ворот, бетонная площадка, три калитки, подпорная стена. Вышеуказанные объекты находятся на зем. участке с кадастровым № 240100000003000082 площадью 1,3306 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, целевое назначение – земельный участок для содержания и обслуживания универсальной оптовой базы (право постоянного пользования). Кап. строение с инв. № 200/С-59954 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 35,8 м, наименование – хозбытовая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства. Кап. строение с инв. № 200/С-59955 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 426,45 м, наименование – электрическая сеть, назначение – сооружение специализированное энергетики. Кап. строение с инв. № 200/С-59956 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 57,85 м, наименование – водопроводная сеть, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения. Кап. строение с инв. № 200/С-59957 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Горбачевского, 25, протяженность – 70,75 м, наименование – ливневая канализационная сеть, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства.

**Обременение:** договора аренды № 1/2015 от 02.02.2015 сроком по 31.12.2024, № 13-юр/3663 от 20.09.2022 сроком по 12.10.2024, № 15-юр от 11.11.2022 сроком по 22.02.2024, № 18-юр от 18.02.2023 сроком по 13.02.2024, № 20-юр от 10.05.2023 сроком по 21.05.2024, № 22-юр от 26.10.2023 сроком по 07.11.2024.

**Нач. цена: 654 171,13 бел. руб. с учетом НДС.**

**Задаток:** 65 417,11 бел. руб.

**Дата, время и место проведения повторного аукциона: 28.02.2024 в 15.00 по адресу:** г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, д. 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Срок внесения задатков и окончания приема документов: с 12.02.2024 с 8.30 по 27.02.2024 до 17.30.**

Ранее опубликованное извещение: газета «Звязда» 11.01.2023, 15.04.2023, 06.06.2023, 13.07.2023, 05.08.2023, 13.09.2023, 23.12.2023. Задаток перечисляется на р/с ККУП «Витебский областной центр маркетинга» № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции – 40901.

